Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

№ 200 (6779) | 29 жніўня 1940 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Прывітанне Часовага Вярхоўнага Совета Літоўскай ССР таварышу Сталіну.

Прывітанне Часовага Вярхоўнага Совета Латвійскай ССР таварышу Сталіну.

Прывітанне Часовага Вярхоўнага Совета Эстонскай ССР таварышу Сталіну.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

Ю. Розенталь—Глыбока вывучаць гісторыю партыі.

М. Камарскі — Растуць новыя кадры.

У Гомельскім абкоме КП(б)Б.

Па-большэвіцку выканаць Указ ад 26 чэрвеня.

Н. Гіршын — Любімец лодыраў і прагулышчыкаў.

Е. Уздзенскі — Злачынствы і «шакаранні».

НА ТЭМЫ ДНЯ: Падрыхтаваць палітасветустановы да зімы.

АРТЫКУЛЫ:

П. Г. Маскатаў — Да новых перамог стахановскай працы.

П. Кобелеў — Служба ў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце — пачотны абавязак.

Уздым народнай асветы (гутарка з наркомам асветы БССР тав. Е. І. Уралавай).

І. Анісовіч — Умела выхоўваць першакласнікаў.

БІБЛІЯГРАФІЯ. Г. Таран — Зборнік вершаў А. Куляшова на рускай мове.

ЗА РУБЯЖОМ:

Зводка германскага камандавання.

Англа-германская паветраная вайна.

Тактыка германскай авіяцыі.

Бамбардыроўка Лондана.

«Дзінст аус Дэйчланд» аб новай фазе наступлення на Англію.

Інцыдэнты на румына-венгерскай граніцы.

Выкананне зернапаставак— першачарговая задача

ашэнні партыі і ўрада аб змяненнях алітыцы загатовак і закупак сельска-адарчых прадуктаў з'явіліся магутным мулам далейшага ўсебаковага развіц-грамадскай калгаснай вытворчасці. У а на ўнесеныя Цэнтральным Камітэ-ВКП(б) і Соўнаркомам СССР важней-н змяненні ў палітыку загатовак і за-ак сельскагаспадарчых прадуктаў у асной вёсцы з новай сілай разгарну-і соцыялістычнае спаборніцтва за окі сталінскі ўраджай.

утнасць рашэнняў партыі і ўрада аб ненях у палітыцы загатовак і заку-сельскагаспадарчых прадуктаў важло-ца ў тым, што, пачынаючы з гэтага , кожны калгас здае абавязковыя па-кі ўсіх сельскагаспадарчых прадук-не з плана сяўбы, як гэта было ра-, а з кожнага гектара замацаванай за гасам зямлі. Партыя і ўрад паставілі чу, каб кожны гектар грамадскай лі — крыніцы сілы і магутнасці гасаў — быў найбольш правільна і на скарыстан, каб сельская гаспадарка ала багата прадуктаў для совецкай іны.

рэспубліцы завяршаецца ўборка зер-ых. Тысячы калгаснікаў, узброеных ннямі ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб ры і загатоўках сельскагаспадарчых дуктаў, паспяхова закончылі ўборку атага ўраджаю азімых і яравых кала-ых і выканалі свае абавязацельствы ад дзяржавай па зернапастаўках.

Перадавыя калгасы лічаць сваім свя-ным абавязкам выканаць першую аведзь — разлічыцца ў тэрмін з дзяр-ай па ўсіх відах паставак сельскагас-арчых прадуктаў.

Выдатны прыклад дзяржаўнай дысцы-ны паказваюць калгаснікі перадавой рэспубліцы ордэнаноснай сельскагаспа-чай артэлі імені Валадарскага, Магілеў-га раёна. Высокаякасна правёўшы рку багатага ўраджаю, яны арганізава-абмалот і здачу збожжа дзяржаве. Ва-арны ў лік дзяржаўных паставак лі 147 цнт. высокаякаснага зярна, насцю выканаўшы свае абавязацель-ы. За праведзеныя работы МТС з гаса прылічвалася 234 цнт. зярна, гаснікі здалі 284 цнт. 50 цнт. зерна-х яны ўнеслі авансам у лік натур-аты за прадстаячую малацьбу. З пер-х абмалотаў разлічыўся з дзяржавай і гас імені Сталіна, Іванаўскага раёна, скай вобласці. На дзяржаўныя склады на 189 цнт. зярна высокай кандыцыі.

Поўнасцю разлічыліся па збожжапа-ўках усе новыя калгасы Дамачаўска-, Гайнаўскага і Шэрашэўскага раёнаў эсцкай вобласці.

Там, дзе совецкія і партыйныя арга-цыі мабілізавалі шырокія масы калгас-саў на большэвіцкае выкананне рашэн-ў ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб уборцы загатоўках сельскагаспадарчых прадук-ў, — дасягнуты значныя поспехі. На жніўня Камарынскі раён выканаў авязацельствы перад дзяржавай па ожжапастаўках на 55 проц., Веткаўскі ён — на 52,6 проц. У заходніх аб-сцях рэспублікі перадавымі па выканан-збожжапаставак з'яўляюцца Несвіж-і, Шчучынскі, Цеханавецкі, Граеўскі і гінецкі раёны.

Побач з гэтым у рэспубліцы нямала ёнаў, дзе дзяржаўныя пастаўкі пушча-ся на самацёк. Напрыклад, якое апраў-нне можа быць для кіраўнікоў Маха-ага, Віцебскага, Горацкага, Дрыбінска-, Кіраўскага, Плешчаніцкага і Чырво-слабодскага раёнаў, якія выканалі пла-ы зернапаставак на 11—17 проц.? У ходніх абласцях самымі адстаючымі яўляюцца Відзаўскі, Шаркаўшчынскі і дуцішкаўскі раёны — Вілейскай обла-і, Парэцкі і Крынкаўскі — Беластоц-й вобласці, і Камянецкі — Брэсцкай бласці.

Адна з сур'ёзных прычын адставання ў ернапастаўках — маруднае разгортванне алацьбы. На 25 жніўня па БССР абма-очан убраны ўраджай толькі на 29,4 роц.

У многіх раёнах існуе парочная прак-ыка, калі да гэтага часу малатарні ТС і калгасаў не ўключаны ў работу. Багушэўскім раёне не выконваецца ашэнне ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб убор-ы і загатоўках сельскагаспадарчых пра-уктаў, дзе зусім ясна сказана: «Не да-ускаць спазнення з абмалотам збожжа забяспечыць пачатак абмалоту хлябоў е пазней 5 дзён пасля пачатку каса-ніцы, арганізаваўшы ў першую чаргу алацьбу з конпаў. Забяспечыць работу алатарань МТС і соўгасаў не менш 20 адзін у суткі».

Кіраўнікі Багушэўскага раёна не арга-ізавалі бесперабойную малацьбу. У Багушэўскай і Стайкаўскай МТС днямі прастайваюць малатарні. Па плану Ба-гушэўская МТС павінна абмалаціць сёлета ўраджай з 4.380 гектараў, фактычна-ж абмалочана ўсяго з 399 гектараў. МТС і напалавіну не выканала плана камбай-навай уборкі. Больш таго, на камбайна-вай уборцы дапускаюцца велізарнейшыя страты ўраджаю. Напрыклад, у калгасе імені Войкава, дзе працуе камбайн, убра-ныя ўчасткі ўсеяны калоссямі. Падліча-на, што на кожным квадратным метры знаходзіцца па 36 калоссяў. На кожным гектары страты ўраджаю дасягаюць больш 2 цнт. Можна толькі дзівіцца, чаму Ба-гушэўскі райком партыі і райвыканком абыякава глядзяць на падобныя факты злачынных адносін да захавання калгас-нага ўраджаю.

У Багушэўску няправільна зразумелі рашэнне ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб скарыстанні пасля сканчэння ўборкі ўраджаю камбайнаў на стацыянарнай малацьбе. Дырэктар Стайкаўскай МТС тав. Крукаў не гледзячы на тое, што ў калгасах яшчэ далёка не закончана ўборка, чамусьці пераключыў камбайны на стацыянарную малацьбу.

Інтарэсы дзяржавы — вышэй за ўсё. Выкананне абавязацельстваў па пастаўках сельскагаспадарчых прадуктаў — непахісны закон. Партыя і ўрад патрабуюць забяспечыць своечасовае выкананне зернапаставак кожным калгасам, соўгасам, калгасным двaром і адпаасобнай гаспадаркай. І зусім нецярпіма, калі некаторыя кіраўнікі партыйных і совецкіх арганізацый аказваюцца ў палоне антыдзяржаўных тэндэнцый асобных калгасаў і калгаснікаў. Гэта-ж факт, што кіраўнікі Жыткавіцкага райвыканкома замест таго, каб па-большэвіцку арганізаваць здачу зярна, натураплату за работу МТС і зварот дзяржаўных ссуд, рашылі прасіць Соўнарком БССР аб замене асобным калгасам натураплаты за работу МТС грашовай платай. Ці не яскрава, што жыткавіцкія кіруючыя работнікі папалі на вудачку адсталых элементаў, чым па сутнасці патураюць антыдзяржаўным тэндэнцыям.

Пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР на час уборкі і выканання плана загатовак дазволена выдаваць авансам калгаснікам і на ўнутрыгаспадарчыя патрэбы калгасаў не больш 15 проц. ад колькасці фактычна зданага на дзяржаўныя загатоўчыя пункты зярна. Гэтае рашэнне партыі і ўрада ў радзе калгасаў груба нарушаецца. Так, у калгасе «Чырвоная зорка», Журавіцкага раёна, праўленне калгаса, стаўшы на антыдзяржаўны шлях, больш 70 проц. абмалочанага збожжа раздала калгаснікам авансам, не выканаўшы дзяржаўныя пастаўкі. Такія факты маюць месца і ў калгасе «Вызваленне», Рэчыцкага раёна. Праўленне гэтага калгаса размеркавала 8 тон зярна ў той час, як дзяржаве здана менш палавіны гэтай колькасці. Партыйныя і совецкія арганізацыі, пракуратура і суд павінны рашуча спыняць малейшыя антыдзяржаўныя тэндэнцыі.

Не ўсе партыйныя і совецкія арганізацыі раёнаў і абласцей улічылі ўрокі мінулага года, калі многія аднаасобнікі, карыстаючыся патураннем мясцовых арганізацый, не выканалі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Як паказваюць факты, у Рэчыцкім, Барысаўскім, Быхаўскім і Чэрвеньскім раёнах і сёлета аднаасобнікі нарушаюць дзяржаўную дысцыпліну і не выконваюць абавязацельстваў па зернапастаўках. Такое становішча зусім непрыпіма. Да тых, хто прабуе ігнараваць інтарэсы дзяржавы, трэба прымаць самыя рашучыя меры.

Не могуць быць цярпімы і абыякавыя адносіны да выканання натураплаты за работу МТС і звароту ссуд. За правільнае налічэння натураплаты, своечасовае ўручэнне рахункаў калгасам за выкананыя МТС работы і здачу зярна калгасамі па ўручаных рахунках адказнасць перад дзяржавай нясуць дырэктары МТС.

Уручанне рахункаў калгасам за работы МТС па рашэнню ЦК ВКП(б) і СНК СССР павінна праводзіцца не пазней тыднёвага тэрміну пасля атрымання паведамленняў ад упаўнаважанага Наркамзага аб аднясенні калгасаў да разраду ўраджайнасці, а за касьбу, камбайнавую ўборку, абмалот і зерначыстку — не пазней тыднёвага тэрміну з дня праведзенай МТС работы. У Магілеўскай-жа вобласці рахункі калгасам уручаны ўсяго на 18 проц. прылічваючайся натураплаты, у Гомельскай вобласці — на 22 проц.

Працоўнае сялянства заходніх абласцей рэспублікі, год таму назад вызваленае Чырвонай Арміяй з-пад панскага гнёту, упершыню здае збожжа сваёй роднай дзяржаве. Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі раду раёнаў з велізарным уздымам выконваюць абавязацельствы па пастаўках. Побач з гэтым у раёнах, дзе слаба пастаўлена палітыка-масавая работа, праводзяць сваю гнусную дзейнасць варожыя элементы. Напрыклад, у Грудненскім сельсавеце, Косаўскага раёна, кулакі зацягваюць абмалот і гэтым самым выкананне абавязацельстваў па зернапастаўках. У Сямяціцкім раёне, Брэсцкай вобласці, кулацкія элементы прабуюць здаць дзяржаве нядобраякаснае зярно. Тут мелі месца факты, калі на дзяржаўны склад дастаўлялася мокрае зярно, змешанае з пяском. Гэтыя факты абавязваюць партыйныя і совецкія арганізацыі заходніх абласцей узмацніць рэволюцыйную пільнасць, забяспечыць выкананне абавязковых зернапаставак кожнай гаспадаркай ва ўстаноўлены ўрадам тэрмін.

Выкананне зернапаставак — першачарговая задача кожнага калгаса, калгасніка і аднаасобнай гаспадаркі. Ліпеньскі пленум ЦК ВКП(б) даў разгорнутую праграму барацьбы ўсіх партыйных і совецкіх арганізацый, зямельных органаў, кіраўнікоў МТС і калгасаў за паспяховае правядзенне ўборкі ўраджаю і выкананне планаў загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў. Рашэнні ліпеньскага пленума Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) павінны быць па-большэвіцку ператвораны ў жыццё.

ПРЫВІТАННЕ ЧАСОВАГА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА ЛІТОЎСКАЙ ССР таварышу СТАЛІНУ

ТАВАРЫШУ ІОСІФУ ВІСАРЫЁНАВІЧУ СТАЛІНУ

Часовы Вярхоўны Совет Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі вітае Вас, вызваліцеля нашай краіны, нашага дарагога настаўніка і вялікага правадыра!

Мы глыбока ўдзячны Вам за тую ўвагу, якую Вы ўдзялялі і ўдзяляеце нашай маладой Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы. Зварот Паўнамоцнай Камісіі Народнага Сейма ў Літву ператварыўся ў сапраўднае народнае свята. Рабочыя Літвы адказалі на прыняцце Літоўскай ССР у сям'ю совецкіх народаў масавым рухам за павышэнне прадукцыйнасці працы, першымі расткамі стаханаўскага руху. Працоўнае сялянства з энтузіязмам узялося за перабудову сельскай гаспадаркі на новых пачатках, абяцаўшы поўнасцю і ў тэрмін убраць ураджай і засеяць палі.

З сёнешняга дня асноўным законам нашага жыцця з'яўляецца вялікая Сталінская Канстытуцыя, якая прынесла народам Совецкага Саюза нябачаны росквіт, ператварыла СССР у самую дэмакратычную ў свеце краіну. Ад гэтага часу народ Літвы будзе карыстацца ўсімі правамі грамадзян Совецкага Саюза, запісанымі ў Сталінскай Канстытуцыі. У гэты ўрачысты час абяцаем Вам, вялікі настаўнік, што ніколі не забудзем і тых святых абавязкаў, якія на нас усклада Канстытуцыя — абавязкаў самаадданага прапаваць на карысць сваёй соцыялістычнай бацькаўшчыны, абараняць яе не шкадуючы сіл і самога жыцця.

Няхай жыве Усесаюзная комуністычная партыя (большэвікоў)!

Няхай жыве правадыр працоўных усяго свету, які вядзе нас ад перамогі да перамогі, — вялікі Сталін!

ПРЫВІТАННЕ ЧАСОВАГА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА ЛАТВІЙСКАЙ ССР таварышу СТАЛІНУ

ДАРАГІ ІОСІФ ВІСАРЫЁНАВІЧ!

У дзень прыняцця Сталінскай Канстытуцыі Часовы Вярхоўны Совет Латвійскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі шле Вам — тварцу самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі — палкае большэвіцкае прывітанне!

Латвійскі працоўны народ доўгія годы прыгнятаўся і быў палітычна бяспраўным. Надышоў час, калі працоўныя Латвіі атрымалі поўную свабоду, атрымалі права на працу, права на асвету, права на адпачынак.

Часовы Вярхоўны Совет Латвійскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і разам з ім увесь латвійскі народ запэўняе Вас, Іосіф Вісарыёнавіч, што прыкладзе ўсе свае сілы, усю энергію на ўмацаванне маладой Латвійскай Совецкай Рэспублікі, на ўмацаванне дружбы народаў СССР.

Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя!

Няхай жыве правадыр і настаўнік усяго працоўнага чалавецтва наш дарагі таварыш Сталін!

ПРЫВІТАННЕ ЧАСОВАГА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА ЭСТОНСКАЙ ССР таварышу СТАЛІНУ

У гістарычны дзень у жыцці вызваленага эстонскага народа Часовы Вярхоўны Совет Эстонскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі шле Вам, таварыш Сталін, палкае сардэчнае прывітанне!

Сёння, 25 жніўня 1940 года, мы, народнае прадстаўніцтва, прынялі Канстытуцыю, якая адкрывае нам дарогу да свабоды і светлай будучыні.

Працоўныя Эстоніі дасягнулі даўно жаданай мэты — арганізаваць сваё жыццё, сваю гаспадарку і культуру пад Вашым кіраўніцтвам. Выпрацаваная Вамі самая дэмакратычная ў свеце Канстытуцыя з'яўляецца маяком для працоўных усяго свету. Вызвалены эстонскі народ бязмежна шчаслівы тым, што на аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі распрапавана і прынята Канстытуцыя нашай Эстонскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя!

Няхай жыве наш вялікі настаўнік і правадыр таварыш Сталін!

На радзіме стаханаўскага руху

СЕРГО, 27 жніўня. (ТАСС). На шахце «Цэнтральнае-Ірміно» імені Сталіна — калыбелі стаханаўскага руху — з вялікім уздымам рыхтуюцца сустрэць знамянальнае пяцігоддзе. Ва ўсіх у памяці дзень, калі Стаханаў устанавіў гістарычны рэкорд. З таго часу да непазнаванасці змянілася шахта, выраслі людзі.

Пачынальнікі вялікага ўсенароднага руху — Стаханаў і Дзюканаў пяпер дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і вучацца ў Промакадэміі імені Сталіна.

За пяць год на шахце выраслі дзесяткі новых перадавікоў стаханаўскай працы. Іх імёны вядомы ўсяму Данбасу. Забойшчык Сінягоўскі першым у шахце прымяніў метад строенай работы, значна павялічыў прадукцыйнасць адбойнага малатка. Забойшчык Валуйскі прымяніў новы спосаб падбойкі пласта, у тры разы павялічыўшы прадукцыйнасць. Прыкладу паследавалі ўсе забойшчыкі ўчастка і даюць 2—2½ нормы. 500 жанчын дасканала авалодалі прафесіямі шахцёраў.

Лепшыя людзі шахты ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза. Намаганнямі стаханаўцаў і камандзіраў вытворчасці шахта «Цэнтральнае-Ірміно» імені Сталіна заняла пачотнае месца сярод перадавых прадпрыемстваў Совецкага Саюза. Яна датэрмінова выканала васьмімесячны план вуглездабычы.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ДЫРЭКТАРОЎ ШКОЛ ФЗВ

Учора ў Доме партыйнага актыва адкрылася ўсебеларуская нарада дырэктароў школ фабрычна-заводскага вучнёўства, скліканая ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

На нарадзе прысутнічалі народныя камісары, дырэктары трэстаў, прадстаўнікі абкомаў партыі. У рабоце нарады прынялі ўдзел сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка, старшыня СНК БССР тав. Былінскі, намеснік старшыні СНК БССР тав. Захараў, заг. оргінструктарскім аддзелам ЦК КП(б)Б тав. Эйдзінаў, заг. промаддзелам ЦК КП(б)Б тав. Кунін і іншыя.

У парадку дня адно пытанне: аб задачах школ ФЗВ на 1940—41 год. З дакладам выступіў загадчык транспартным аддзелам ЦК КП(б)Б тав. Хасін.

— Вялікая соцыялістычная будоўля ў нашай краіне, — гаворыць тав. Хасін,— патрабуе вялікай арміі кваліфікаваных работнікаў як для прамысловасці, так і для нашага транспарта. Падрыхтоўкай павінны заняцца школы ФЗВ, якія з'яўляюцца асноўнай формай прафесіянальна-тэхнічнай асветы моладзі.

Нямала стаханаўцаў, камандзіраў вытворчасці выхавалі школы фабзавуча. Мінская чыгуначная школа за час свайго існавання выпусціла нямала добрых, кваліфікаваных рабочых. Усяму транспарту вядомы машыніст-крыванасавец тав. Досін, узнагароджаны ордэнам Леніна, які зараз вучыцца ў Прамысловай акадэміі імені Леніна. Былая вучаніца школы ФЗВ «КІМ» т. Тараканава паказвае ўзоры прадукцыйнасці працы і ўзнагароджана ордэнам «Знак почета».

Усё-ж не гледзячы на выключна вялікую ролю школ фабрычна-заводскага вучнёўства, за апошні час у радзе абласцей пайшлі па лініі змяншэння ліку школ і колькасці прымаемых. Наркаматы і трэсты, пад ведамам якіх знаходзіліся гэтыя школы, закінулі гэты ўчастак работы і зусім не клапаціліся аб іх існаванні. У Віцебску, напрыклад, закрылі школу кулінараў, на Заходняй чыгунцы за два годы закрылі 5 школ ФЗВ.

На БССР налічваецца 31 школа з кантынгентам у 3.729 вучняў. Па Мінску абучэннем ахоплена ўсяго толькі 720 чал. Хіба гэта дастаткова? Безумоўна не. Патрэбнасць у кваліфікаваных кадрах велізарная і падрыхтоўкай іх трэба заняцца неадкладна самым сур'ёзным чынам.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР намецілі адкрыць у гэтым годзе 65 новых школ ФЗВ на 14.565 чалавек. Усяго разам з існуючымі будзе ў БССР 96 школ, якія павінны будуць абучаць 22.000 чал.

Па дакладу тав. Хасіна на нарадзе разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі.

— Праграмы абучэння ў школах ФЗВ абутнікаў, — гаворыць т. Леепсон, — (Віцебск), складзеныя ў 1930 г., на базе так званага вінтавога метада пашыўкі, устарэлі. Амаль усе абутковыя прадпрыемствы перайшлі ўжо на новы метад пашыўкі, а школы ФЗВ рыхтуюць людзей па старых праграмах. Пры тым нашы прадпрыемствы папоўніліся новымі відамі машын, больш прадукцыйных, як «Дапель» і інш., а практычнае абучэнне вучняў праводзіцца на старых машынах. І, натуральна, школы выпускаюць рабочых нізкай кваліфікацыі, якія часам не ў сілах асвоіць складаныя працэсы работы.

У спрэчках таксама выступілі т. Кордас (дырэктар школы ФЗВ Бабруйскага лесакамбіната) і т. Белецкі (школа ФЗВ тарфянікаў Наркамата паліўнай прамысловасці), якія адзначылі, што кіраўнікі прадпрыемстваў, пры якіх знаходзяцца школы фабрычна-заводскага вучнёўства, недастаткова ўвагі звяртаюць на падрыхтоўку высокакваліфікаваных рабочых для вытворчасці.

На нарадзе з прамоваю выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка, які паставіў рад практычных задач па паляпшэнню работы школ фабрычна-заводскага вучнёўства і падрыхтоўцы да вучэбнага года.

Выдатныя поспехі тав. Гараўцова

ЖЛОБІН. Пятую гадавіну стаханаўскага руху знатны камбайнер Жлобінскай МТС ордэнаносец Гараўцоў сустракае новымі поспехамі. Працуючы на камбайне «Сталінец», Владзімір Гараўцоў убраў звыш 600 гектараў, выканаўшы дзве гадавыя нормы. Уборка камбайнам прадаўжаецца.

У агрэгаце тав. Гараўцова працуе знатны трактарыст Андрэй Чорнагаловы. За стаханаўскую работу ён узнагароджан Вялікай залатой медаллю Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Сёлета тав. Чорнагаловы на трактары ЧТЗ выпрацаваў 620 гектараў пры гадавой норме 400 гектараў.

За месяц камбайнавай уборкі тав. Гараўцоў зарабіў каля 3 тысяч рублёў. 11 жніўня тав. Гараўцоў убраў 56 гектараў. У гэты дзень ён зарабіў 364 рублі.

Трактарыст Чорнагаловы за 28 дзён жніўня выпрацаваў 339 прадпадзён. У знамянальны дзень 11 жніўня ён выпрацаваў 42 прадпадні. Зарабіў-жа за месяц 60 пудоў зярна, 120 пудоў бульбы і 850 рублёў грашыма.

Перавыконваюць нормы выпрацоўкі

ВАСІЛЕВІЧЫ. Выдатнымі поспехамі сустракаюць пятую гадавіну стаханаўскага руху трактарысты Васілевіцкай МТС. 35 трактарыстаў штодзённа перавыконваюць нормы выпрацоўкі, эканомячы гаручае.

Удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі Архіп Прохаравіч Сопат на трактары ХТЗ у гэтым годзе ўжо ўзараў 500 гектараў, замест 320 па плану, і зэканоміў 1.000 кілограм гаручага.

Удзельнік выстаўкі Сцяпан Дзмітравіч Фешчанка на трактары ХТЗ узараў 420 гектараў і зэканоміў 450 кілограм гаручага.

Прыкладна працуюць і машыністы малатарняў. Машыніст Андрэй Гутко малатарняй МК-1100 намалачвае штодзённа па 18 тон зярна, пры норме 15. Перавыконвае нормы выпрацоўкі і машыніст Нікалай Сохар.

(БЕЛТА).

Па Совецкай краіне



Па гарадах Совецкага Саюза. На здымку: галоўная алея Парка культуры і адпачынку імені Сталіна ў Тбілісі.
Фото С. Сталярова і Р. Чэркасава. (Фота-кліше ТАСС).

АРГАНІЗАЦЫЯ ЛІТОЎСКАЙ, ЛАТВІЙСКАЙ І ЭСТОНСКАЙ ЧЫГУНАК

У адпаведнасці з рашэннем урада Саюза ССР, Народны Камісар Шляхоў Зносін тав. Кагановіч выдаў загад аб арганізацыі ў новых совецкіх рэспубліках Прыбалтыкі трох чыгунак—Літоўскай, Латвійскай і Эстонскай.

У саставу Літоўскай чыгункі ўключана дзесяць чыгуначных ліній, Латвійскай—столькі-ж і Эстонскай—восем ліній.

Начальнікам Літоўскай дарогі назначан тав. Лахматаў, Латвійскай—тав. Вараб'ёў, Эстонскай—тав. Мельгуноў.

Упраўленне Літоўскай чыгункі знаходзіцца ў Вільна, Латвійскай—у Рыге, Эстонскай—у Таліне.

ПОМНІК АФЯРАМ БЕЛАГВАРДЗЕЙСКАГА ТЭРОРА

ЛЕНІНГРАД. Тут зроблен манументальны помнік афярам белагвардзейскага тэрора, які будзе ўстаноўлен на акраіне горада Кінгісепа ў «Роще пятисот», дзе ў 1919 годзе белагвардзейская банда Юдзеніча зверска замучыла пяцьсот чырвонаармейцаў, партызан і мясцовых жыхароў.

ВЫДАННЕ ТВОРАЎ ДЖАМБУЛА

АЛМА-АТА. Вышаў з друку зборнік паэм і вершаў на рускай мове народнага акына Казахстана Джамбула.

За апошнія тры годы творы Джамбула выдаваліся ў Алма-Ата шэсць разоў—на казахскай, рускай і ўйгурскай мовах.

ЗАКОНЧЫЛІ ЎБОРКУ ЗЕРНАВЫХ

ЧЭРНОВІЦЫ. Усе восем соўгасаў Букавіны закончылі ўборку зернавых. У Садагурскім і Старажынецкім соўгасах абмалочана больш палавіны скошанага збожжа. (ТАСС).

Памяці Барбюса

30 жніўня спаўняецца пяць год з дня смерці выдатнага рэволюцыйнага пісьменніка, вялікага друга працоўных—Анры Барбюса.

У 1916 годзе Барбюс выпусціў свой першы рэволюцыйны раман «В огне», у якім ён смела і ярка выкрыў сапраўдную падаплеку імперыялістычнай вайны. Ужо ў той час Барбюс карыстаўся сусветнай вядомасцю. Але ў царскай Расіі творы пісьменніка не выдаваліся.

Толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі кнігі Барбюса сталі здабыткам шырокіх мас працоўных СССР. Яго апошняя кніга «Сталін» стала адной з папулярнейшых кніг у Еўропе. Паводле даных Усесаюзнай Кніжнай Палаты, творы Барбюса выданы ў СССР на 19 мовах, агульным тыражом у 1.921 тысячу экземпляраў.

У Маскве памяці Барбюса прысвячаюцца спецыяльныя выстаўкі і вечары, арганізуемыя ў парках і на прадпрыемствах. (ТАСС).



Зборка машын на галоўным канвееры «ЗІС-101» маскоўскага аўтазавода імені Сталіна.
Фото В. Дарафеева. (Фота-кліше ТАСС).

ПАД 68 ПАРАЛЕЛЛЮ

НАР'ЯН-МАР. Вялікай папулярнасцю ў запалярных раёнах карыстаецца нар'янмарская занальная станцыя. Пад 68 паралеллю вырашчваюцца памідоры, цвятная капуста, морква, гуркі, радыс. Гароднінтвам паспяхова займаюцца соўгасы і дзесяткі калгасаў Ненецкай нацыянальнай акругі. З кожным годам усё далей на поўнач прасоўваюцца пшаніца і ячмень.

Вясной мінулага года на палях станцыі паявілася новая расліна кок-сагыз.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ГЛЫБОКА ВЫВУЧАЦЬ ГІСТОРЫЮ ПАРТЫІ

Пастанова ЦК ВКП(б) «Аб пастаноўцы партыйнай прапаганды ў сувязі з выпускам «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» дала напрамак усім партыйным арганізацыям, як правільна і эфектыўна арганізаваць вывучэнне гісторыі партыі.

Пасля дэтальнага абмеркавання пастановы ЦК з комуністамі і беспартыйнымі таварышамі нашага калектыва больш 80 чалавек рашылі вучыцца самастойна. Нямала прышлося папрацаваць над тым, каб прывіць таварышам густ да самастойнай вучобы, да сур'ёзнай, удумлівай работы над кнігай.

Перад намі паўстала задача — выясніць, з якімі цяжкасцямі сустракаюцца таварышы, самастойна працуючыя над вывучэннем асноў марксізма-ленінізма, аказаць ім канкрэтную дапамогу.

Рашылі па вузлавых пытаннях гісторыі партыі наладжваць папулярныя лекцыі. На сёння праведзена 9 лекцый: па твору Леніна «Што рабіць?», на тэму «Тэорыя і тактыка большэвіцкай партыі ў пытаннях вайны, міру і рэволюцыі» і інш. Усе лекцыі чыталіся высокакваліфіцыраванымі лектарамі і прапагандыстамі (тт. Саевічам, Ільюшыным, Элімелахам і іншымі). На правядзімыя кансультацыі таксама запрашаліся кваліфіцыраваныя кансультанты.

Зараз асноўная маса комуністаў і беспартыйных спецыялістаў прыступіла да вывучэння IX разлзела, а асобныя беспартыйныя таварышы вывучаюць VI і VII разлзелы падручніка.

Другой формай дапамогі і кантролю, якую мы шырока ўжываем, з'яўляюцца тэарэтычныя субяседванні. Мы іх праводзілі не па цэлых разлзелах, а па асобных тэмах. Такіх субяседванняў праведзена шэсць: «Аб ленінскім плане пабудовы партыі новага тыпу», «Прычыны паражэння першай рускай рэволюцыі», «Аб дыялектычным і гістарычным матэрыялізме» і т. д. Усе яны прайшлі ажыўлена, пры актыўным удзеле ўсіх прысутных. Заўсёды выступала па 8—10 чалавек, прычым выступленні насілі глыбокі, пралуманы характар.

Практыка паказала, што прымяненне такой формы кантролю і дапамогі, як тэарэтычныя субяседванні, поўнасцю сябе апраўдала. Гэта пацвярджаюць тыя гутаркі, якія я часта праводжу з комуністамі і беспартыйнымі таварышамі. Па думцы таварышоў, добра падрыхтаваныя субяседванні прыносяць вялікую карысць у замацаванні прапрапоўваемага матэрыялу.

Усё-ж такі трэба сказаць, што ў правядзенні гэтай работы ёсць істотныя недахопы. На нашых субяседваннях прысутнічаюць далёка не ўсе самастойна вывучаючыя гісторыю ВКП(б). З 80 чалавек прысутнічае ў сярэднім 16—18. Гэта аб'ясняецца тым, што субяседванні мы праводзім не дыферэнцыравана, без уліку ўзроўню развіцця і ведаў таварышоў. 6 чалавек—комуністаў і беспартыйных — тт. Аксёнаў, Шэрман, Прошак, Анісовіч і іншыя закончылі вывучэнне Кароткага курса. Зараз яны прыступілі да вывучэння асобных твораў класікаў марксізма-ленінізма.

Упорная, настойлівая работа партыйных і непартыйных большэвікоў над павышэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню дае свае багатыя рэзультаты. Вось што гаворыць аб гэтым старшы інжынер-комуніст т. Кажэкін:

— Раней, да вывучэння гісторыі ВКП(б), я таксама цікавіўся палітыкай, быў у курсе ўсіх падзей, якія адбываліся навокал. Але трэба прызнацца, што ў радзе актуальных пытанняў мне цяжка было разабрацца. Часамі я не мог даць усебаковай правільнай ацэнкі падзеям. Зусім іншае зараз, калі я вывучаю IX разлзел — паслякастрычніцкі перыяд гісторыі партыі.

У сваёй пераважнай большасці наш калектыў складаецца са спецыялістаў, якія ў совецкі час закончылі ВНУ. Таму я лічу буйнейшым недахопам у рабоце нашай пярвічнай партыйнай арганізацыі той факт, што вывучэнне Кароткага курса недапушчальна расцягваецца. Не сакрэт-жа, што рад таварышоў вывучае яшчэ толькі першыя разлзелы, а некаторыя прачыталі падручнік і гэтым абмежаваліся.

Перад намі стаіць адказная задача — прывіць густ да самастойнай вучобы, да павышэння ідэйна-палітычнага ўзроўню кожнаму члену нашага калектыва.

Ю. Х. РОЗЕНТАЛЬ,
сакратар партарганізацыі Белпромпраекта.

Растуць новыя кадры

Адным з найбольш вострых і актуальных пытанняў у рабоце партыйных арганізацый заходніх абласцей з'яўляецца вырошчванне і расстаноўка кадраў з мясцовага актыва. Антапольскі райком партыі і ўся партарганізацыя раёна з першага-ж дня свайго існавання аддала гэтаму пытанню асаблівую ўвагу.

Праведзеныя дзесяцідзённыя і пяцідзённыя курсы агітатараў далі магчымасць райкому бліжэй пазнаёміць мясцовы актыў з работай па-новаму. Выканаўшыя свае функцыі сялянскія камітэты таксама далі дзесяткі актывістаў грамадскай работы. Лепшыя з членаў гэтых камітэтаў вылучаны на совецкую і каператыўную работу.

Да жніўня месяца ў раёне ўжо налічвалася 112 вылучэнцаў з мясцовага актыва, у тым ліку 20 жанчын. Хто яны?

Селянін-бядняк з вёскі Мазуры — Васіль Кірычэнка з'яўляецца старшынёй Беразнянскага сельсовета. Гэты сельсовет трымае пяршынства ў раёне па правядзенню палітычна-гаспадарчых мерапрыемстваў. Селянін-бядняк Васіль Галадзюк працуе старшынёй Акцябрскага сельсовета. Гэта таксама адзін з перадавых сельсоветаў. Былы батрак Нікалай Бурчак — зараз участковы ўпаўнаважаны міліцыі. Батрак Якаў Шораб з вёскі Дзятковічы загадвае злівачным пунктам Маслапрома.

Гэты спісак можна было-б прадоўжыць. Многія мясцовыя актывісты вылучаны на работу ў раённыя арганізацыі.

Сялянка Аляксандра Ярмашук, прасядзеўшая пры польскай уладзе доўгі час у турме, працуе інструктарам райвыканкома. Селянін Аляксей Валасюк загадвае канторай Белплодагароднины. Селянін Нікалай Кузьміч, вызвалены толькі з прыходам Чырвонай Арміі з турмы, вылучан загадчыкам аддзела сацыяльнага забеспячэння. Як і цэлы рад іншых вылучэнцаў, усе яны спраўляюцца з даручанай ім работай.

Райком партыі аказвае ім сістэматычную дапамогу. Большасць з гэтых маладых кадраў пабывалі ў райкоме КП(б)Б. Сакратары райкома асабіста гутараць з імі, даюць парады. Аддзел кадраў таксама часта выклікае вылучаных таварышоў для гутарак або аказвае ім практычную дапамогу на месцы.

Бюро райкома часта заслухоўвае даклады сакратароў пярвічных партарганізацый аб рабоце з вылучэнцамі. Нядаўна былі заслуханы даклады сакратароў партарганізацый райвыканкома і раённага аддзялення міліцыі. Райком намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па змяшчэнню недахопаў у рабоце гэтых партарганізацый з маладымі кадрамі.

А недахопы ў гэтай галіне яшчэ, бясспрэчна, ёсць. Галоўны з іх — недастатковае вылучэнне маладых кадраў. У совецкі апарат пралазяць часам чуждыя элементы.

Не гледзячы на поспехі, якіх дабілася райпартарганізацыя ў вырошчванні кадраў, нельга ні на мінуту паслабляць гэтай работы. У раёне ёсць усе ўмовы для росту кадраў. Трэба толькі ўважліва і клапатліва выяўляць іх, вывучаць і дапамагаць ім у росце.

М. КАМАРСКІ,
намеснік загадчыка аддзела кадраў Антапольскага РК КП(б)Б Брэсцкай вобласці.

У Гомельскім абкоме КП(б)Б

ГОМЕЛЬ, 27 жніўня. (Кар. «Звязды»). Бюро Гомельскага абкома КП(б)Б на сваім пасяджэнні 25 жніўня заслухала даклад сакратара Цэнтральнага райкома КП(б)Б горада Гомеля тав. Майзліса аб партыйным кантролі над правядзеннем у жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня.

Бюро абкома адзначыла, што Цэнтральны райком горада Гомеля і рад пярвічных партыйных арганізацый яшчэ не арганізавалі сістэматычнага кантролю над правядзеннем у жыццё Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня, у выніку чаго прамысловасць раёна ў ліпені план выканала ўсяго на 86,6 проц., а за дзве дэкады жніўня толькі 6 прадпрыемстваў з 25 выканалі план. Фонд зарплаты за ліпень перавышан на 3,3 проц.

Яшчэ па гэты дзень мае месца недапушчальна вялікая колькасць прагулаў, спазненняў на работу і самавольнае пакідание прадпрыемстваў і ўстаноў. За чэрвень па 25 прадпрыемствах было 313 выпадкаў прагулаў, за ліпень — 161 і толькі за дзве дэкады жніўня — 113 выпадкаў нарушэнняў працоўнай дысцыпліны. А на асобных прадпрыемствах, як швейная фабрыка «Комінтэрн», суднаремонтны завод, шчаціннная фабрыка, Палесдрук, лік прагулаў і іншых нарушэнняў працоўнай дысцыпліны не памяншаецца, а павялічваецца.

Не выкаранена яшчэ і практыка незаконнага волпуску на 2—3 дні «за свой кошт», што па сутнасці з'яўляецца патураннем прагульшчыкам і стварае лазейку для нарушальнікаў працоўнай дысцыпліны. Так, напрыклад, начальнік канторы сувязі тав. Унук 22 ліпеня выдаў загад, які санкцыяніруе ад'езд члена партыі, работніка бюро прэтэнзій, Урэцкай на 2 дні. Начальнік цэха завода імені Кірава тав. Баскін адпусціў на дзень слесара Зельманава без асаблівых на тое прычын, у той час як на гэтым заводзе ёсць вялікая колькасць гадзін звышчасовай работы.

Цэнтральны райком КП(б)Б горада Гомеля да апошніх дзён па сутнасці не ажыццяўляў кантроль над выкананнем Указа ад 26 чэрвеня, недаацэніў ролі пярвічных партыйных арганізацый у гэтай справе. Да 16 жніўня райком не праверыў і не заслухаў на сваім пасяджэнні ні адной пярвічнай партыйнай арганізацыі па гэтаму пытанню. Асобныя пярвічныя партыйныя арганізацыі і кіраўнікі прадпрыемстваў ліберальна адносіліся да прагульшчыкаў і іншых нарушальнікаў працоўнай дысцыпліны з партыйнымі білетамі ў кішэні, абмяжоўваючыся толькі вынясеннем ім спагнанняў.

Пярвічная партыйная арганізацыя облбудтрэста і гаралскога аддзела аховы здароўя вынесла злосным прагульшчыкам Канцавому і Дзіважову вымовы. З 6 спраў аб прагульшчыках з партыйнымі білетамі райком разглядзеў толькі 3. Справа прагульшчыка члена ВКП(б) Хаміча (Горжылупраўленне), які асуджан народным судом, яшчэ не разгледжана райкомам. Дырэктар завода дэзапаратуры тав. Штрэмер і яго намеснік тав. Аўчыннікаў не перадавалі ў суд справы аб прагульшчыках.

Пярвічныя партыйныя арганізацыі раёна не дапамагаюць і не кіруюць комсамольскімі арганізацыямі ў справе ажыццяўлення Указа ад 26 чэрвеня. Цэнтральны райком комсамола, следуючы практыцы райкома партыі, на прапяту ўсяго часу не заслухаў ні адной комсамольскай арганізацыі аб барацьбе за вытворчую дысцыпліну сярод моладзі.

Сярод прагульшчыкаў горада ёсць 18 комсамольцаў. Райком комсамола разглядзеў толькі 3 справы аб прагульшчыках —членах комсамола. Справа комсамольца абутковай фабрыкі «Праца» Арончыка, які асуджан за кражу, па гэты дзень яшчэ не абмеркавана бюро райкома комсамола.

Бюро абкома партыі адзначыла таксама абсалютна недапушчальны лібералізм у практыцы работы некаторых участковых суддзяў Цэнтральнага раёна горада.

Народны суддзя 8 участка тав. Ешчын апраўдаў прагульшчыка работніка рыбучастка Смірнова, які з'явіўся на работу ў п'яным выглядзе. Мае месца масавы выклік сведак у суд у рабочы час.

Бюро абкома прапанавала бюро Цэнтральнага райкома КП(б)Б сваю галоўную ўвагу звярнуць на хутчэйшае выпраўленне памылак, дапушчаных радам арганізацый раёна ў справе ажыццяўлення кантролю над правядзеннем у жыццё Указа ад 26 чэрвеня.

Цэнтральнаму, Новабеліцкаму і Чыгуначнаму райкомам КП(б)Б прапанавана ў бліжэйшыя-ж дні абмеркаваць на бюро рашэнне абкома партыі і намеціць канкрэтныя мерапрыемствы, якія-б забяспечылі поўнае ажыццяўленне Указа на ўсіх прадпрыемствах і ва ўстановах горада.

Групорг вязальнага цэха змены «А» насочнага ўчастка чулочна-трыкатажнай фабрыкі «КІМ» (Віцебск), ордэнаносец О. А. Пучкова гутарыць з многастаночнікамі аб сустрэчы новымі вытворчымі падарункамі XXVI Міжнароднага юнацкага дня.
Фото І. Лосева. (Фотахроніка БЕЛТА).

Служба ў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце—пачотны абавязак

П. П. КОБЕЛЕЎ
Генерал-маёр авіяцыі, Старшыня Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма СССР

У адпаведнасці з законам аб усеагульным воінскім абавязку з 15 верасня па 15 кастрычніка па ўсёй нашай краіне пачнецца чарговы прызыў моладзі на ваенную службу. Маладое пакаленне, дасягнуўшае прызыўнога ўзросту, сустракае дзень уступлення ў рады воінаў краіны сацыялізма, як вялікае свята, як самую радасную падзею ў жыцці.

Совецкі народ надае велізарнае значэнне гэтай дзяржаўнай справе. Ён заклапочан тым, каб даць высокаякаснае папаўненне ў рады свайго ўзброенага вартавога — Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Ваенная служба ў СССР — пачотны абавязак, і працоўныя нашай краіны даюць ідучым на ваенную службу наказ—апраўдаць з чэсцю давер'е народа так, як належыць патрыёту краіны сацыялізма.

З непярпеннем чакаюць прызыўнікі дня прызыва, а некаторыя з іх падаюць заявы аб датэрміновым залічэнні ў рады Чырвонай Арміі.

Вось што піша тав. Петрушэнкаў І. І. з горада Ельня, Смаленскай вобласці, у сваім пісьме ў Наркамат абароны:

«Маю вялікае жаданне стаць датэрмінова ў рады нашай Рабоча Сялянскай Чырвонай Арміі. Я хачу быць танкістам, вадзіцелем грозных машын... Я клянуся абараняць нашу Совецкую ўладу з усім уменнем і адвагаю. Я клянуся абараняць сваю радзіму, не шкадуючы крыві сваёй і самога жыцця для дасягнення поўнай перамогі над ворагам».

Такія заявы сведчаць аб высокім патрыятызме нашага народа і бязмежнай любві яго да Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Служба ў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце — пачотны абавязак, але разам з тым і цяжкі, патрабуючы ад байца фізічнай загартоўкі і выносліванасці, бездакорнай воінскай дысцыпліны і высокіх маральных якасцей.

Прызыўнік, які ідзе ў рады Чырвонай Арміі, павінен ведаць, што яго чакаюць суровая абстаноўка, сур'ёзная баявая вучоба. Ён будзе жыць і навучацца ва ўмовах, максімальна набліжаных да баявых, яму прадстаіць выхаваць у сабе валявыя якасці, здольнасць перамагаць труднасці, звязаныя з вайной, здольнасць пераадольваць усе перашкоды ў імя перамогі над ворагам.

Такія цяжкія задачы можа выканаць фізічна развіты, маральна ўстойлівы і пісьменны прызыўнік.

Асоавіяхімаўскія арганізацыі разам з комсамолам, профсаюзамі і добраахвотнымі спартыўнымі таварыствамі пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый таксама прымаюць удзел у падрыхтоўцы прызыўнікоў—членаў Асоавіяхіма да службы ў Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце.

Так, напрыклад, Краснадарскі гарадскі совет Асоавіяхіма падрыхтаваў з ліку прызыўнікоў варашылаўскіх коннікаў. Моладзь, прайшоўшая спецыяльную падрыхтоўку авалодала верхавой яздой, навучылася выдатна валодаць шабляй і лагладзіць каня. У радыёшколе гэтага-ж горсовета зараз займаецца 65 прызыўнікоў. Яны вывучаюць радыётэхніку. Асоавіяхімаўская арганізацыя Ленінградскага завода імені Жданава, пры актыўнай дапамозе камандзіраў запасу, пачала з прызыўнікамі вывучэнне тактычнай падрыхтоўкі.

Моладзь прызыўнога ўзросту выглядае ў гэтым годзе яшчэ больш культурнай і палітычна развітай. 26,8 проц. маскоўскіх прызыўнікоў скончылі няпоўную сярэднюю школу. Значная група прызыўнікоў—гэта юнакі, толькі што скончыўшыя сярэднюю школу. Сярод іх нямала з саліднай агульнаадукацыйнай падрыхтоўкай. Шэсць процантаў прызыўнікоў Масквы маюць вышэйшую асвету. Такім чынам, Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот прымуць у свае рады шматлікі атрад маладой совецкай інтэлігенцыі.

Сярод прызыўнікоў Масквы — 87,8 процанта варашылаўскіх стралкоў, 95,5 проц. значкістаў ПВХА, звыш 1.500 снайпераў, тысячы пілотаў, парашутыстаў, кулямётчыкаў.

Масква накіроўвае ў армію сваіх лепшых сыноў. 11 прызыўнікоў узнагароджаны ордэнамі СССР, трое — медалямі; 10 чалавек — дэпутаты раённых і гарадскога советаў дэпутатаў працоўных.

Выдатнае папаўненне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскому Флоту паступіць з Ленінграда. Горад не ласць ні аднаго непісьменнага байца. У ліку прызыўнікоў — нямала ўдзельнікаў баёў з фінскай белагвардзейшчынай, паказаўшых ужо ў суровай абстаноўцы сваю адданасць, бязмежную любоў да сацыялістычнай радзімы. Такі, напрыклад, баец лыжнага батальёна—добраахвотнік, рабочы мэблевай фабрыкі — Аўраменкаў. У ноч на 23 лютага ён з чатырма байцамі быў у дазоры. Выявіўшы роту лыжнікаў праціўніка, Аўраменкаў сустрэў яе кулямётным агнём і затрымаў да падыходу палмацавання. Урал узнагародзіў Аўраменкава ордэнам «Красной звезды». У гэтым годзе прызываецца ў армію Герой Совецкага Саюза седовец Буйніцкі.

Не толькі ў гарадах рыхтуецца выдатнае папаўненне. Калгасы таксама пасылаюць у армію і флот сваіх перадавых людзей. Так, напрыклад, усе дацрызыўнікі калгаса імені Карла Маркса, Бахоўскага раёна, Нікалаеўскай вобласці, маюць па тры абаронныя значкі; прызыўнікі Задарожны, Самодзін, Нюнін, Масюкін і іншыя маюць па чатыры абаронныя значкі. Зараз яны здаюць нормы на пяты значок—«Мараж».

Да чарговага прызыва ў Чырвоную Армію асталіся лічаныя дні. Асноўная задача ўсіх грамадскіх арганізацый — паставіць зараз на належную вышыню ваенную прапаганду сярод прызыўнікоў. На канкрэтных прыкладах баявой дзейнасці войск і асобных байцоў — удзельнікаў баёў на рацэ Халхын-Гол, пры разгроме лініі Мангейма ў Фінляндыі — паказаць, што перамога над ворагам патрабуе безупыннага ўдасканальвання і вучобы.

Грамадскія арганізацыі ў гарадах і ў вёсках павінны прыняць актыўны ўдзел у афармленні памяшканняў зборных пунктаў у момант прызыву. Трэба паказаць на спецыяльных выстаўках і стэндах праробленую работу па падрыхтоўцы прызыўнога састава і адзначыўшыхся ў гэтай падрыхтоўцы. Арганізаваць выстаўкі, прапагандуючыя ваенную справу, жыццё і вучобу Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Шырока папулярызаваць сярод прызыўнікоў дзеючы зараз закон аб усеагульным воінскім абавязку. Неабходна зрабіць усё для таго, каб прызыўнік на зборным пункце знайшоў адказ на кожнае цікавячае яго пытанне.

Новае папаўненне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота павінна ўступіць у рады абаронцаў радзімы поўнасцю гатовым да авалодання на «выдатна» ўсімі ваеннымі ведамі з тым, каб у найкарацейшы тэрмін выкаваць у сабе ўсе якасці мужнага і кваліфікаванага байца непераможнай краіны сацыялізма.

НА ТЭМЫ ДНЯ

ПАДРЫХТАВАЦЬ ПАЛІТАСВЕТУСТАНОВЫ ДА ЗІМЫ

Завяршаецца сельскагаспадарчы год. Скора надыйдзе зімовы перыяд, у які павінна быць шырока разгорнута культурна-масавая работа сярод калгаснікаў. Калі да гэтага часу гутаркі, чытка газет праводзіліся непасрэдна ў полі, дык зараз яны пераносяцца ў Дом соцкультуры, у хату-чытальню.

Палітасветустанова — цэнтр культурна-асветнай работы на сяле. Тут павінны працаваць гурткі мастацкай самадзейнасці, тут павінна быць арганізавана агратэхнічная вучоба калгаснікаў, наладжваецца гутаркі аб міжнародным становішчы, лекцыі па ўсіх цікавячых калгаснікаў пытаннях.

Для работы палітасветустаноў трэба стварыць належныя ўмовы. Дамы соцкультуры і хаты-чытальні неабходна падрыхтаваць да зімовага перыяда, адрамантаваць і культурна абсталяваць іх.

На жаль, далёка не ўсюды мясцовыя советы дэпутатаў працоўных і органы народнай асветы — непасрэдныя кіраўнікі палітасветустаноў надаюць сур'ёзнае значэнне ўпарадкаванню памяшканняў дамоў соцкультуры і хат-чыталень.

Прывядзем асобныя факты. У Забалапкім і Пятровіцкім сельсоветах, Смалявіцкага раёна (Мінская вобласць), зусім нядаўна пабудаваны новыя памяшканні для дамоў соцкультуры. Але гэтыя памяшканні не абсталяваны. Нават сесці наведвальніку няма на што. Аб іншых выгадах і гаварыць не прыходзіцца. У выніку — дамы соцкультуры, пабудаваныя за кошт дзяржавы для працоўнага сялянства, не могуць пачаць нармальнай работы.

Вялікім недахопам у рабоце мясцовых советаў дэпутатаў працоўных з'яўляецца тое, што яны іменна на гэтым імкнуцца зэканоміць сродкі. Даходзіць да таго, што апушчаныя ўрадам сродкі на рамонт і абсталяванне памяшканняў палітасветустаноў зусім не скарыстоўваюцца. Так, напрыклад, па Беразоўскаму раёну (Брэсцкая вобласць) для рамонту хат-чыталень адпушчана 5 тыс. рублёў, асвоена ўсяго... 44 рублі. Такое-ж становішча і ў радзе раёнаў Беластоцкай вобласці. У Ланскім раёне, напрыклад, ёсць Сакольскі Дом соцкультуры. Для яго адведзена добрае памяшканне з чатырма пакоямі і залы. Але Дом зусім не абсталяваны: няма лавак, крэслаў, стаў... Адпушчаныя 8 тыс. рублёў не выкарыстаны на патрэбы ДСК. І толькі 300 р. выканком сельсовета адважыўся адпусціць на дробныя выдаткі для Дома культуры. Безумоўна, што і работа ў гэтым Доме соцкультуры пастаўлена дрэнна.

Мясцовыя арганізацыі чамусьці махваюцца ад пытання ўпарадкавання памяшканняў палітасветустаноў, лічыць гэта не сваёй справай. І зараз, калі спела пытанне аб рамонце, яны не замаюцца гэтым. Вось у Амгавіцкай хаты-чытальні, Слушкага раёна (Мінская вобласць), разбурыліся печы, праваліліся столь, а выканком сельсовета і не думае заняцца рамонтам. У Станькаўскай хаты-чытальні, Дзяржынскага раёна, гэтай-жа вобласці, адсутнічае мэбля, падлога. І хоць бы каго-небудзь гэта непакоіла...

Такое становішча яўна ненармальнае. ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове аб рабоце культасветустаноў абавязаў совецкія органы клапаціцца аб дамах соцкультуры, хатах-чытальнях, бібліятэках, стварыць ім усе неабходныя ўмовы для работы.

Трэба не адкладаючы заняцца рамонтам і абсталяваннем дамоў соцкультуры і хат-чыталень. Гэтыя важныя і неабходныя ўстановы павінны падрыхтавацца сустрэць зіму, каб калгаснік мог тут культурна праводзіць свой вольны ад працы час.

Партыйныя арганізацыі абавязаны праверыць становішча спраў на мясцовых дапамагчы палітасветустановам сустрэць зімовы сезон падрыхтаванымі. Ужо зараз трэба правесці інструктаж работнікаў палітасветустаноў, скласці планы к... крэтнай работы.

Хата-чытальня і Дом соцкультуры павінны стаць цэнтрам палітыка-выхаваўчай і культурна-асветнай работы на сяле.

НАПЯРЭДАДНІ ВУЧЭБНАГА ГОДА

Умела выхоўваць першакласнікаў

Праз некалькі дзён шчаслівая дзетвара нашай сацыялістычнай радзімы запоўніць школы. Васьмігадовыя грамадзяне краіны сацыялізма ўжо ведаюць пра школу — ім аб ёй расказалі браты, сёстры і таварышы. Частка дзяцей была ў дзіцячых садах і прыблізна ведае ўмовы школьнага жыцця. Але ўсё-ж школа для іх — установа незвычайная. Ад школы яны чакаюць многа новага, цікавага. Гэта абавязвае калектыў настаўнікаў надаць вялікае значэнне першаму класу. Трэба, каб з першага-ж дня вучань палюбіў школу, яе парадкі, настаўнікаў, сваіх таварышоў.

Мне прышлося аднаго разу запытаць настаўніка бельскай школы, Ушацкага раёна, Н. П. Жукава: «Як у вас, Ніканор Прохаравіч, з дысцыплінай у школе?»

— Дысцыпліна добрая, — адказаў ён. — Я ніколі не павышаю на вучняў голасу, з першага-ж дня падружыўся з імі і маленькая мая заўвага на іх робіць уплыў, ім становіцца сорамна, што я прымушан рабіць заўвагі. Ніколі не было выпадку, каб я спазніўся на ўрок або прышоў неакуратна апрануты. І яны стараюцца браць прыклад з мяне.

А вось зусім адваротны прыклад. Маладая настаўніца 1-й слуцкай сярэдняй школы тав. Ш. заўсёды вела матэрыял і нядрэнна падавала яго вучням, але трымаць дысцыпліну ў класе не ўмела. Яна вельмі часта за малейшае нарушэнне дысцыпліны крычала на вучняў, коса глядзела на іх і нават не звяртала ўвагі, калі вучні праяўлялі ініцыятыву і давалі добрыя адказы на ўроках. «У мяне ёсць прыкладныя вучні, — гаварыла яна,—Вера, Хава, Роза». У выніку — Веру, Хаву і Розу вучні недалюблівалі, называлі любімчыкамі і нават у карыдорах часта падстаўлялі ім ножку.

Не трэба думаць, што васьмігадовы вучань не ўяўляе сабе свайго ўчынку. Калі з першага дня вучань нарушае дысцыпліну, значыць яго паступак чым-небудзь абумоўлен: або абстаноўка ў школе ці класе гэтаму спрыяе, або хатняе выхаванне дало повад гэтаму, або вучня не задавальняе вучоба. Што-б ні было прычынай, настаўнік павінен у першы-ж дзень аб гэтай прычыне ведаць. Трэба памятаць і аб тым, што вучань, які прышоў у першы раз у школу, павінен выконваць свае абавязкі. Трэба дабівацца безагаворачнага выканання патрабаванняў настаўніка, дабівацца гэтага ўменнем настойліва.

Перад пачаткам заняткаў настаўнік павінен абмеркаваць з бацькамі пытанні аб іх дапамозе школе ў выхаванні і навучанні дзяцей. Бацькі з вялікай ахвотай прымуць удзел у гэтым, і іх дапамога будзе вельмі карыснай.

Часта бацькі прыходзяць у школу і просяць уладзейнічаць на вучня, каб лепш трымаў сябе дома. А бывае і наадварот: настаўнік выклікае бацькоў у школу па пытанню паводзін іх сына ў школе. «Ваш сын вельмі дрэнна вядзе сябе ў школе», — заяўляе звычайна настаўнік.

Бацьку або мацеры не зусім прыемна слухаць такія заявы настаўніка, і яны часам не знаходзяць слоў, што адказаць яму. І вельмі метка і правільна адказала бацька вучня Казлоўскага адной з настаўніц 1-й слуцкай сярэдняй школы:

«Вас у школе 30 настаўнікаў; вас вучылі, як выхоўваць дзяцей і якраз з поваду выхавання свайго сына я хаджу за дапамогай звярнуцца да вас, а вы просіце дапамогі ў мяне».

Настаўніца не знайшла слоў, што адказаць бацьку. Ён быў праў.

З гэтага трэба зрабіць вывад, што ў каторыя настаўнікі завязваюць сувязь з бацькамі толькі тады, калі вучань сістэматычна нарушае дысцыпліну ў школе.

З адказу тав. Казлоўскага відаць, што вучань дома яшчэ больш нарушае дысцыпліну, а гэта спрыяе і нарушэнню дысцыпліны ў школе. Настаўніца-ж гэтага не ведала, была адарвана ад бацькоў, ад хатняга жыцця вучняў.

Перш чым прыступіць да заняткаў настаўнік павінен звязацца з бацькамі, ведаць хатнія ўмовы вучня і на працягу ўсяго вучэбнага года трымаць з бацькамі цесную сувязь.

У першы дзень заняткаў настаўнік, які вядзе першы клас, павінен прысці ў школу асабліва падрыхтаваны, прадумаўшы глыбока, як лепш правесці першыя заняткі. Ад гэтага будзе залежаць далейшая работа класа; і вучні, і прыкладу першага класа, будуць сябе весці так і ў старэйшых класах.

І. АНІСОВІЧ,
загадчык сектара пачатковых і сярэдніх школ Мінскага аблана.

Школа ў поўнай гатоўнасці

Доўская сярэдняя школа, Журавіцкага раёна, добра падрыхтавалася да надыходзячага новага вучэбнага года. Школа поўнасцю ўкамплектавана настаўнікамі. Усе вокны, падлога, парты, класныя дошкі адрамантаваны і перафарбаваны. Класы выглядаюць прыгожа і ўтульна.

Дырэкцыя школы своечасова набыла вучэбна-наглядныя дапаможнікі, кабінеты лакладных навук папоўнены новымі прыборамі, загатоўлены чарніла, мялкі. Завезена 120 кубаметраў дроў.

У гэтым годзе ў школе адкрываецца новы, IX клас. Скора прасторныя, светлыя класы запоўніць шчаслівая калгасная дзетвара.

Ал. КАЗЫРНОВІЧ.

У кансерваторыі

З усіх канцоў Совецкага Саюза — з Беларусі, Ленінграда, Грузіі, Куйбышэва, Смаленска і інш. паступаюць заявы аб прынятці ў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю. Прыймовыя іспыты паказалі, што ў гэтым годзе ў кансерваторыю прышлі даравітыя, здольныя юнакі і дзяўчаты, з поспехам закончыўшыя музыкальныя вучылішчы. Прыймовая камісія адзначыла высокія веды і музыкальныя здольнасці паступіўшых.

Прыём у кансерваторыю ў асноўным закончан. На першы курс прыняты былыя калгаснікі, выдатна закончыўшыя Магілеўскае музыкальнае вучылішча, скрыпачы тт. Васільеў і Брацельнікаў, выдатніца Ленінградскай музыкальнай дзесяцігодкі — скрыпачка т. Беленькая, выдатніца Сухумскага музыкальнага вучылішча т. Солеймезьян і іншыя. На чацвёрты курс кансерваторыі прынят студэнт 5-го курса Ленінградскай кансерваторыі т. Дворкін. Ён будзе вучыцца па класу віяланчэлі ў лаўрэата ўсесаюзнага конкурса выканаўцаў тав. Власава.

2 верасня студэнты кансерваторыі пачнуць вучобу ва ўсіх аддзяленнях і класах. Упершыню ў гэтым годзе адкрываецца па клас баяна.

Кансерваторыя поўнасцю забяспечана высокакваліфікаванымі педагогамі.

(БЕЛТА).

Па-большэвіцку выканаць Указ ад 26 чэрвеня!

ЛЮБІМЕЦ ЛОДЫРАЎ І ПРАГУЛЬШЧЫКАЎ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Кіраўнікі мельскай канторы сувязі ўспрынялі каз Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР 26 чэрвеня, як чарговую кампанію, ы якой можна крыху пашумець і суноіца. Уся работа па рэалізацыі гэга важнейшага закона звялася к таму, го 27 чэрвеня правялі мітынг, затым ульны сход калектыва. А далей усё ю па-старынцы.

Павелічэнне рабочага часу не ўнесла ен у работу канторы сувязі і яе адлаў. Працоўная дысцыпліна тут да гэга часу на вельмі нізкім узроўні. Як і ней, маюць месца спазненні, прагулы, падкі самавольнага пакідання работы. Ніжэй мы прыводзім вытрымкі з загаў начальніка канторы тав. Унука. Яны усёй яснасцю паказваюць, што аўтар з'яўляецца клапатлівым шэфам прагульшчыкаў і дэзарганізатараў вытворчасці.

18 ліпеня рассыльны тэлеграфа Калёў зрабіў прагул. Тав. Унук разцмаў, што рабіць, якія меры прыняць яго. і нарэшце на шосты дзень, малізуючы ўсе свае здольнасці, ён застраў загад № 138. У § 1 ён піша:

«Тав. Кавалёў у выніку фізічнага нестатку пераблытаў выхомныя мні. За роблены прагул тав. Кавалёва трэба быо прыцягнуць да адказнасці, але, прыаючы пад увагу яго фізічны недастаік (глухаваты), абвяшчаю яму суровую ымову з папярэджаннем і ўтрыманнем рошай за прагул».

Інструктар бюро прэтэнзій, член парты т. Урэпкая на працягу трох дзён не 'яўлялася на работу. Як высветлілася, на была ў ад'ездзе па сваіх асабістых правах. Але тав. Унук у загалзе піша:

«Адлучку т. Урэпкай лічыць уважлівай. Першы дзень залічыць за тое, што . Урэпкая працавала 12 сакавіка, а руті дзень залічыць у лік адпачынку».

Куды аднесці трэці дзень прагулу? Аб этым тав. Унук яшчэ, відаць, напіша арговы загад.

20 ліпеня тэлеграфістка Фрунзінская пазнілася на работу па 30 мінут. У загадзе за № 151 чытаем:

«У сувязі з тым, што т. Фрунзінская е была знаёма з графікам, лічыць спазненне яе ўважлівым».

Наогул трэба сказаць, што графік раоты адзелаў сувязі з'яўляецца лазейкай ля прагульшчыкаў і дэзарганізатараў вытворчасці. Усе прагулы і спазненні ў канторы сувязі адносяцца за лік няведання графіка. Вось прыклад. Пісьманосец ідзела дастаўкі тав. Жураўлёва 2 ліпеня павінна была працаваць да 18 гадзін, фактычна-ж яна працавала да 14 гадзін 5 мінут. Брыгадзір тав. Канавалаў 21 ліпеня павінен быў з'явіцца на работу ў 7 гадзін раніцы, а прыйшоў у 16 гадзін. Усе гэтыя «ненармальнасці» былі адлесены за лік няведання графіка выхаду на работу.

Прагульшчыкі і лодыры лічаць тав. Унука «добрым начальнікам». І не выпадкова: ён заўсёды ідзе ім насустрач.

У канторы зусім адсутнічае дакладны ўчот прыходу на работу і пакідання работы. Па табельнай кнізе нельга ўстанавіць, ці працавала работніца Маскалёва з 2 па 19 жніўня. Не відаць таксама, ці працавалі работніцы Прыходзька, Хайкіна і іншыя.

Такая сістэма ўчоту безумоўна не садзейнічае ўмацаванню працоўнай дысцыпліны ў калектыве. Прагульшчыкам і дэзарганізатарам вытворчасці пад апекай начальніка жывецца тут нядрэнна, супроць іх не ствараецца грамадская думка.

Пераход на 8-гадзінны рабочы дзень і 7-дзённы тыдзень дае ўсе магчымасці палепшыць абслугоўванне працоўных. Аднак гэтыя магчымасці кантора сувязі не скарыстоўвае. Пошта і газеты, як і раней, дастаўляюцца адрасатам з вялікім спазненнем. У адзяленне паступаюць шматлікія скаргі на дрэнную дастаўку карэспандэнцыі, на бюракратызм асобных работнікаў пошты. Гэтыя сігналы ніколькі не трывожаць кіраўнікоў канторы

Н. ГІРШЫН.

ЗЛАЧЫНСТВЫ І „ПАКАРАННІ“

(Ад карэспандэнта «Звязды» па Беластоцкай вобласці)

Пасажырскі поезд даставіў на станцыю зялёны службовы вагон. І больш здагадлівым адразу стала зразумела: прыехаў нейкі важны начальнік.

Прайшло некалькі мінут, ніхто не выходзіць з вагона. Гэта зацікавіла людзей —у чым тут справа, хіба пусты вагон прыбыў?

Тымчасам загадачны пасажыр ляжаў у купэ і напружана думаў. Ён гадаў на пальцах: «да» ці «не», інакш—«яшчэ, або хопіць». Указальныя пальцы ніяк не сутыкаліся. «Не, не не»—з засмучэннем шапталі яго вусны. Але раптам—бац!—пальцы сутыкнуліся. Пасажыр выскачыў з вагона і паімчаўся ў станцыйны буфет.

Вярнуцца адтуль было значна цяжэй. Асушаныя ім некалькі чарак гаралкі былі для яго ўжо тымі кроплямі, якія льюцца праз край.

Аднак свет не без добрых людзей. Знайшліся і тут дабракі, якія дапамаглі начальніку дабрацца да зялёнага вагона. Ад іх-жа на станцыі Маладзечна стала вядома, што туды прыехаў сам начальнік службы руху Беластоцкай чыгункі Андронаў. Неўзабаве ўсе асабіста пераканаліся ў гэтым.

Калі другая змена сабралася на кароткую вытворчую нараду, якую транспартнікі называюць «планеркай», з вялікім шумам паявіўся Андронаў. Ледзь стоячы на нагах, ён рашучым тонам патрабаваў, каб назвалі лепшых работнікаў станцыі. Яму заявілі, што нядрэнна, моў, працуе саставіцель паездоў М—іч, ды ёсць і іншыя стахановцы.

— Ага, М—іч! Вылаць яму неадкладна камандыровачны касцюм. Назначаю яго начальнікам чацвертага адзялення чыгункі. Астатніх прэміраваць гадзіннікамі і грашыма. Вось!

— Бацюшка-начальнік,—рашыла скарыстаць момант старушка-прыбіральшчыца,—ці нельга мне венічак новы, а то гэты па прутіках рассыпаецца.

— Не тыкай у нос свой венік. Назначаю цябе машыністам жаночага паравоза, і не енчыць...

Невядома, якія яшчэ вялікія падзеі адбыліся-б у гэты дзень на станцыі Маладзечна, але прыезджы захацеў спаць. Назаўтра раніцой яго вагон пакаціў у Беласток.

Прыгоды Андронава дайшлі да ведама палітадзела і начальніка чыгункі. Выяснілася, што ён з-за надзвычайнага няроўнадушша да гралусных напіткаў страціў аўтарытэт і не раз кампраметураваў упраўленне чыгункі. Меркавалі, раіліся і рашылі неадкладна зняць яго з работы і адправіць... у Маскоўскую транспартную Акадэмію вучыцца. Прыгавор прыведзен у выкананне.

На гэтым можна было-б закончыць вясёлы расказ, але... Калісьці Кузьма Пруткоў гаварыў: «Тры справы, аднойчы пачаўшы, цяжка закончыць; а) ужываць добрую ежу; б) гутарыць з вярнуўшымся з паходу прыяцелем; в) часаць, дзе чэшацца». Хоць са спазненнем амаль на цэлых сто год, хочам яму супярэчыць: «Чатыры, галубок Кузьма, чатыры: г) расказваць беластоцкія чыгуначныя эпізоды.

Сапраўды, ці можна ўмаўчаць аб вы ключнай мяккасардэчнасці работнікаў мясповага дарпрафсожа? Ні за што! Паслухайце:

Ёсць на станцыі Беласток саставіцель паездоў, кандыдат у члены партыі Арлоў. Ён на словах усямерна вітаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. Гэта не перашкодзіла яму 15 ліпеня спазніцца на работу роўна на 1 гадзіну 10 мінут без усякай уважлівай прычыны. Народны суд, як і трэба было чакаць, прыгаварыў прагульшчыка да двух месяцаў папраўчых работ. У работнікаў дарпрафсожа ад жаласці без пераўвелічэння сэрца разрывалася на часткі, і, каб выразіць Арлову сваё спачуванне, яны адразу пасля суда ўручылі яму пуцёўку на курорт у Крым. 25 ліпеня ўзнагароджаны прагульшчык з акна вагона пасылаў сваім дабрадзеям пацалунак.

Цудоўныя людзі сядзяць у службе руху чыгункі. У лютым начальнік станцыі Беласток тав. Харчанка папрасіўся з'ездзіць на Данбас за сям'ёй. Яму далі водпуск на 17 дзён. У ліпені ён зноў падаў заяву з аналагічнай просьбай. Атрымаўшы рэзалюцыю «дазволена», Харчанка зноў праезліў 19 дзён. Цяпер начальнік станцыі загатовіў заяву на чарговы водпуск, пасля чаго адбудзецца яшчэ адна паездка на радзіму спецыяльна за астаўшайся там казой. Чаму-б яму не прагульвань, калі з дзяржаўнай касы ён атрымлівае праязныя і камандыровачныя.

Цудоўны чалавек, якіх нямнога, і намеснік начальніка станцыі Петрэнка. 24 ліпеня яму паведамілі, што стрэлачнік 8-га паста Варакса з'явіўся на дзяжурства, выбачайце, у нецвярозым стане. Стрэлачніка выклікалі ў кабінет, і гэтым візітам ён астаўся вельмі задаволены.

— Ён выпіў толькі 100 (якое вопытнае вока!) грам, на нагах трымаецца пакуль нядрэнна, няхай астаецца на пасту. Я сам буду за ім глядзець, — заключыў Петрэнка.

Усякія якасці ў нас ацэньваюцца па заслугах. Чаму-ж партыйная арганізацыя станцыі не аддала належнае, не абмеркавала нават на сходзе заслугі членаў і кандыдатаў партыі — ну хоць-бы аматара падарожжаў Харчанка, прагульшчыка Арлова, нарушальнікаў працоўчай дысцыпліны Малітіна і Мельніх.

Тым, хто цікавіцца гэтым, раім пагутарыць з намеснікам начальніка палітадзела тав. Раманавым. Ён ўсё раз'ясніць. Аказваецца, што вінават у гэтым былы сакратар партбюро станцыі Літвінаў, яго гнілы лібералізм, недобрасумленныя адносіны да партыйнай работы.

Дзе-ж Літвінаў, што з ім здарылася? Не турбуйцеся. Нічога дрэннага. 28 ліпеня ён з усімі ветліва развітаўся і паехаў у Маскву: палітадзел камандыраваў яго на курсы адказных партыйных работнікаў.

Е. УЗДЗЕНСКІ.

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛІ МЕСЯЧНЫ ПЛАН

ГОМЕЛЬ. Днепра-Дзвінскае рачное параходства датэрмінова выканала жнівеньскі план. 30 тысяч тон грузаў будзе перавезена звыш плана.

За апошнія дні рад параходаў паспяхова праводзіць стахановскія рэйсы. Газаход «Прапагандыст» (капітан тав. Канода) упершыню па рацэ Сож на адлегласці 150 клм. даставіў у Гомель 6 барж вагою ў 800 тон з зярном і бульбай новага ўраджаю. Раней параходы вазілі не больш трох барж. У стахановскім рэйсе газаход «Прапагандыст» выканаў свой план на 340 проц.

У перадавых радах

ЖЛОБІН. Трэцяя дыстанцыя сувязі Жлобінскага чыгуначнага вузла трымае перадавое месца ў радах сувязістаў Беларускай чыгункі. Другі год дыстанцыя нікому не здае пераходны чырвоны сцяг царогі.

З новай энергіяй сталі працаваць сувязісты пасля Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня. У авангардзе ідуць комуністы і комсамольцы. Тэлеграфістка — кандыдат партыі Надзежда Барадаўка стала ініцыятарам соцыялістычнага спаборніцтва за абслугоўванне некалькіх апаратаў. Замест аднаго яна абслугоўвае 3—4 тэлеграфныя апараты. Прыкладу тав. Барадаўкі паследавалі 20 тэлеграфістаў дыстанцыі.

Комуністкі Ганна Варанкова і Лідзія Аляксеева па-стахановску працуюць на тэлефонных апаратах, абслугоўваюць абанентаў за 2,5—3 секунды пры норме ў 8 секунд.

НАПЯРЭДАДНІ СЛАЎНАЙ ГАДАВІНЫ

Уздым народнай асветы

(Гутарка з наркомам асветы БССР тав. Е. І. Уралавай)

За год, мінуўшы з часу вызвалення працоўных Заходняй Беларусі ад беларускага прыгнёту, шмат чаго зроблена ў пабудове новага, вольнага і шчаслівага жыцця. Партыя Леніна—Сталіна і совецкі ўрад зрабілі ўсё неабходнае для таго, каб працоўныя вызваленых абласцей актыўна ўключыліся ў соцыялістычнае будаўніцтва.

З жаслівай яркасцю клопаты партыі і ўрада адчуваюцца ў галіне народнай асветы. Як вядома, у былой панскай Польшчы магчымасць вучыцца мелі толькі дзеці капіталістаў, памешчыкаў і кулакоў. Вялікая колькасць дзяцей працоўных не была ахоплена нават пачатковай школай. Мовы нацыянальных меншасцей у школах былі абвешчаны па-за законам. К таму-ж гвалтоўная паланізацыя абдзірала жаданне ў працоўнага беларускага насельніцтва пасылаць сваіх дзяцей у школу.

Зараз становішча змянілася карэнным чынам. Закон аб усеагульным навучанні ў Совецкім Саюзе ўвайшоў у дзеянне і ў заходніх абласцях БССР. Непараўнальна вырасла колькасць няпоўных сярэдніх і сярэдніх школ. Да совецкай улады на тэрыторыі гэтых абласцей налічвалася ўсяго 74 гімназіі і ліцэі. Зараз замест іх мы маем 1.191 няпоўную сярэднюю і сярэднюю школу, значная частка якіх рэарганізавана з пачатковых школ. Усяго па заходніх абласцях цяпер налічваецца 5.633 школы, у тым ліку 837 адкрытых за гэты год. Разам з тым значная колькасць ранней існавуючых школ расшырана, пераведзена з цесных сялянскіх хат у прасторныя, светлыя будынкі.

Рост школ асабліва выразны ў абласцях, якія належалі ў былой польскай дзяржаве да так званых «усходніх крэсаў», заселеных беларусамі. Тут з асаблівай сілай адчуваўся нацыянальны і соцыяльны прыгнёт. Так, у Баранавіцкай вобласці (па статыстыцы былога польскага ўрада) існавала 864 школы, але на самай справе многія з іх не працавалі. Цяпер тут існуе 1.280 совецкіх школ. У Беластоцкай вобласці было ўсяго 29 гімназій і ліцэяў, а цяпер існуюць 373 няпоўна-сярэднія і сярэднія школы.

Адпаведна гэтаму вырасла і колькасць вучняў. Ужо ў мінулым вучэбным годзе было ахоплена школамі 723.758 дзяцей, г. зн. колькасць вучняў узрасла на 25 проц. у параўнанні з нядаўнім мінулым. У Баранавіцкай-жа, Пінскай і Вілейскай абласцях гэты прыпант яшчэ большы.

Усе дзеці маюць магчымасць вучыцца на сваёй роднай мове. Калі раней у заходніх абласцях БССР школы былі толькі польскія, то зараз мы маем 4.278 беларускіх школ, 173 рускія, 932 польскія, 150 яўрэйскіх, 61 літоўскую і 49 украінскіх. У гэтых цыфрах з усёй яркасцю выражана ленінска-сталінская нацыянальная палітыка нашай партыі, яе клопаты аб росце культуры ўсіх нацыянальнасцей, насяляючых Совецкі Саюз.

Для падрыхтоўкі педагагічных кадраў адкрыта 8 педагагічных вучылішч, 1 педагагічны інстытут і 3 настаўніцкія інстытуты. Між іншым, пры ўладзе польскіх паноў тут не было ні адной вышэйшай навучальнай установы.

Але не толькі ў галіне расшырэння школьнай сеткі дасягнуты такія поспехі. Партыя Леніна—Сталіна няўтомна клапоціцца аб агульным узлыме культуры працоўных вызваленых абласцей. За прайшоўшы год у заходніх абласцях адкрыта шырокая сетка палітасветных установаў. Адных толькі бібліятэк існуе зараз 188, замест 42 ранейшых. За першае паўгоддзе 1940 года адкрыта 77 дамоў соцыялістычнай культуры і 697 хат-чытальнь. 830 тысяч экземпляраў кніг накіравана ў заходнія абласці. Зараз у кожным раёне ёсць у сярэднім ад 3 да 5 тысяч тамоў кніг. Аб гэтым у былой панскай Польшчы прапоўны і думаць не мог, бо бібліятэкі былі для яго недаступнымі. Імі карысталіся толькі прывілегіраваныя класы.

Партыя і ўрад клапоцяцца таксама і аб дашкольным выхаванні дзетвары. У заходніх абласцях зараз існуюць 93 дзіцячыя сады.

Як паказваюць прыведзеныя цыфры, для працоўных заходніх абласцей Беларусі надышоў такі перыяд росквіту культуры, аб якім яны не маглі і марыць пры капіталістычным ладзе і які магчым толькі ва ўмовах краіны соцыялізма. Задача наша зараз заключаецца ў тым, каб работу школ, палітасветных установаў і органаў народнай асветы заходніх абласцей пабудаваць так, каб яны ні на крок не адставалі ад работы органаў народнай асветы ва ўсходніх абласцях Совецкай Беларусі.

ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ СТАХАНАЎСКАЙ ПРАЦЫ

П. Г. МАСКАТАЎ
Сакратар ВЦСПС

Стахановскаму руху пяць год. Працоўныя СССР сустракаюць слаўную гадавіну новымі вытворчымі перамогамі, дэманстрыруючы найглыбейшую адданасць справе комунізма і гатоўнасць у магчыма больш кароткі тэрмін ажыццявіць асноўную эканамічную задачу СССР — дагнаць і перагнаць найбольш развітыя капіталістычныя краіны і ў эканамічных адносінах.

Карэнні стахановскага руху, — як указваў таварыш Сталін у сваёй гістарычнай прамове на Першай усесаюзнай нарадзе стахановцаў, — перш за ўсё ў паляпшэнні матэрыяльнага становішча совецкіх рабочых, у знішчэнні ў СССР эксплаатацыі. Соцыялістычная рэволюцыя дала працоўным не толькі свабоду, але і матэрыяльныя выгоды і акружыла чэсную працу на карысць грамадства арэолам славы.

Стахановскі рух прадстаўляе новы, вышэйшы этап соцыялістычнага спаборніцтва. Яго крыніцай з'явіліся новая тэхніка і новыя людзі, авалодаўшыя гэтай тэхнікай.

У адказ на заклік таварыша Сталіна «асядлаць тэхніку» і «скарыстаць яе да дна» Стахановы, Крыванос, Бусыгін, Вінаградавы, Сметанін і іншыя перадавыя людзі соцыялістычнай прамысловасці і транспарта ўзяліся за пошукі новых шляхоў для больш прадукцыйнага скарыстання машын, праявілі смеласць у ломцы застарэлых норм, апракінулі «прадзельчаскія тэорыі» і далі ўзоры новай, небывалай прадукцыйнасці працы. Так пачалася адна з самых слаўных старонак у гісторыі нашага соцыялістычнага будаўніцтва.

***

За пяць год стахановскі рух гіганцка вырас ушыр. Здзейснілася прадбачанне таварыша Сталіна, які сказаў на Першай усесаюзнай нарадзе стахановцаў: «Сёння стахановцаў яшчэ мала, але хто можа сумняваецца, што заўтра іх будзе ўдесяцера больш?». К пачатку 1940 года стахановцы складалі на транспарце дзве пятых, у прамысловасці — трэць, на будаўніцтве — чвэрць агульнай колькасці рабочых. Армія стахановцаў прамысловасці і транспарта налічвае ў сваіх радах ужо да 3½ мільёнаў чалавек.

У рады стахановцаў шырокай хваляй уліваюцца свежыя сілы і ў іх колькасці жанчыны, авалодваючыя новымі для іх прафесіямі, якія раней лічыліся мужчынскімі. Усёй краіне вядомы імёны першай жанчыны — паравознага машыніста З. Троіцкай, першай жанчыны-сталявара Т. Іпалітавай.

Расце атрад стахановцаў соцыялістычнага сяла. Ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў 1939 годзе прымала ўдзел 156 тысяч выдатных стахановцаў земляробства і жывёлагадоўлі, у 1940 годзе — 265 тысяч. Працаваць па-стахановску — стала лозунгам і для інжынерна-тэхнічных работнікаў, і для работнікаў совецкага гандлю, і для служачых дзяржаўных установаў. Стахановскі рух стаў усенародным.

Сталінскі прынцып соцыялістычнага спаборніцтва — «...таварыская дапамога адстаўшым з боку перадавых, з тым, каб дабіцца агульнага ўздыму» — увасобіўся ў канкрэтныя справы. Ужо ў самым пачатку стахановскага руху па ініцыятыве рабочага-абутніка Яшына ўзніклі кароткатэрміновыя стахановскія школы. Цяпер гэта — агульнапрызнаная форма перадачы стахановскага вопыту. Побач са школамі гэтай задачы служаць шэфства стахановцаў над рабочымі, якія не выконваюць норм, і індывідуальная дапамога ім, грамадскі стахановскі інструктаж, абмен вопытам на вытворчых нарадах, лекцыі стахановцаў у клубах і чырвоных кутках, па радыё, кнігі і артыкулы стахановцаў.

Развіваючыся ўшыр, стахановскі рух падышоў шчыльна да арганізацыі калектыўнай стахановскай работы не толькі асобных брыгад або пралётаў, але і цэлых цэхаў і прадпрыемстваў. Да гэтага-ж падвялізіць развіццё руху ўглыб—усё далей ідучая стахановская рацыяналізацыя вытворчасці, якая робіць у нашай прамысловасці сапраўдную рэволюцыю.

Рацыяналізатарская мысль Стаханава і Бусыгіна, Вінаградавых і Сметаніна была накіравана галоўным чынам на арганізацыю па-новаму рабочага месца, на больш рацыянальную расстаноўку людзей і механізмаў. Крыванос унёс рэволюцыйныя змяненні ў тэхнічную эксплаатацыю паравознага катла, Гудаў — у тэхналогію фрэзеравання, Мазай — у сталеварэнне.

Крок за крокам стахановская рацыяналізацыя расшырала круг свайго ўздзеяння: стахановцы ўдасканальвалі інструмент і прыстасаванні, перабудоўвалі і напова стваралі тэхналогію, дабіваючыся паскарэння вытворчага працэса. Немалую ролю ў развіцці стахановскай рацыяналізацыі і ў перадачы перадавога вопыту адыгралі грамадскія агляды абсталявання, інструмента, прыстасаванняў. Па-новаму арганізуючы працу і спалучаючы гэту арганізацыю з больш прадукцыйнымі прыёмамі працы, стахановцы паклалі пачатак скарасным метадам у будаўніцтве, у рамонтнай справе, на горных работах, на пагрузачна-разгрузачных работах.

Стахановская праца з'явілася асновай для ўнядрэння графіка, для прымянення так званай цыклічнасці пры здабычы вугалю.

У барацьбе за ўшчыльнэнне рабочага дня стахановцы прыклалі сваё ведание тэхніці і ўменне лічыць час не толькі мінутамі, але і секундамі, да вырашэння новых задач — сумяшчэння прафесій і адначасовай работы на некалькіх станках. Пераход на многастаночнае абслугоўванне быў разам з тым адказам совецкіх патрыётаў на заклік таварыша Молатава да рабочых і сялян, служачых і інтэлігентаў чэсна і самааддана працаваць для ўмацавання гаспадарчай і абаронная магутнасці СССР.

Зараз намаганні стахановцаў-рацыяналізатараў накіраваны на ажыццяўленне малой механізацыі і аўтаматызацыі абсталявання, на яго мадэрнізацыю пры дапамозе новых прыстасаванняў. Пачын у гэтых адносінах зрабілі слесар Сталінградскага трактарнага завода т. Іначкін і наладчык 1-га дзяржпадшыпнікавага завода т. Волкаў.

На чыгуначным транспарце зарадзіўся выдатны рух за прадоўжанне тэрміну службы машын і механізмаў, шляхам спалучэння стахановскага скарыстання іх з беражлівым доглядам. Паравозныя машыністы, вадзіцелі аўтамашын і пілоты, доменшчыкі і сталявары, трактарысты і камбайнеры, нарэшце, рабочыя-станочнікі самых розных спецыяльнасцей падхапілі гэту ініцыятыву машыніста А. Папавіна.

Перадавыя камандзіры вытворчасці пабольшэвіцку ўключыліся ў стахановскі рух. Інжынерна-стахановскія комплексныя брыгады, узнікшыя на многіх прадпрыемствах, па прыкладу вядомай гудаўскай брыгады, з поспехам распрацоўваюць і ўнядраюць стахановскую тэхналогію, аказваюць неабходную вытворча-тэхнічную дапамогу многастаночнікам, аб'ядноўваюць вакол сябе рабочых вынаходнікаў і рацыяналізатараў. Інжынерна-тэхнічныя работнікі ў якасці кансультантаў прымаюць удзел у арганізацыі кароткатэрміновых стахановскіх школ, дапамагаюць пачынаючым рабочым аўтарам. У канструктарскіх бюро і тэхнічных праектных канторах прадпрыемстваў і трэстаў усё шырэй пачынаюць прымяняць скарасное праектыраванне машын.

Сіла стахановскага руху — у яго масавасці. Рэкорды выдатных стахановцаў пракладвалі дарогу новым, больш высокім тэхнічным нормам. Пашыраючы свае метады работы, стахановцы падцягвалі адстаючых і дапамагалі ім авалодаць гэтымі нормамі. Тое, што было некалі рэкордам, з цягам часу ў рэзультаце арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў, праведзеных па ініцыятыве стахановцаў, рабілася агульнай нормай.

Такім чынам, стахановскі рух, будучы адным з самых выдатных вынікаў другой сталінскай пяцігодкі, забяспечыў датэрміновае выкананне заданняў пяцігодкі ў галіне прамысловасці і транспарта. Прадукцыйнасць працы ў прамысловасці павялічылася на 82 процанты, замест 63 процантаў па плану, у будаўніцтве — на 83 процанты, замест 75 процантаў па плану. У трэцяй пяцігодцы дасягнут далейшы рост соцыялістычнай гаспадаркі і ўзлым прадукцыйнасці працы. Пачатае ў 1939 годзе, па ініцыятыве рабочых завода «Красный пролетарий», спаборніцтва ў чэсць XVIII з'езда ВКП(б) ператварылася затым ва ўсенароднае спаборніцтва імені Трэцяй сталінскай пяцігодкі. За адзін 1939 год прадукцыйнасць працы ў прамысловасці паднялася на 16,7 процанта. У пачатку 1940 года калектыў Маскоўскага інструментальнага завода выкінуў лозунг — выканаць заданне трэцяй пяцігодкі па прадукцыйнасці працы за чатыры гады. Гэты лозунг стаў сцягам для мільёнаў людзей, прымаючых удзел у соцыялістычным спаборніцтве.

***

У цяперашняй міжнароднай абстаноўцы, чрэватай ўсякімі нечаканасцямі, Совецкі Саюз павінен яшчэ больш узмацніць сваю абаронную і гаспадарчую магутнасць. Трэба выпускаць за магчыма больш кароткі тэрмін больш сродкаў узбраення, машын, механізмаў. Усе галіны народнай гаспадаркі павінны даваць цяпер больш прадукцыі. А для гэтага трэба працаваць больш і прадукцыйней. Гэтага патрабуюць карэнныя інтарэсы народа. Па ініцыятыве Ўсесаюзнага цэнтральнага совета прафесіянальных саюзаў, падтрыманай мільёнамі рабочых і работніц, служачых, інжынераў і тэхнікаў, Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР выдаў Указ аб пераходзе на васьмігадзінны рабочы дзень, на сямідзённы рабочы тыдзень і аб забароне самавольнага пакідання рабочымі і служачымі прадпрыемстваў і ўстаноў. Новы закон умацоўвае соцыялістычную дысцыпліну працы і стварае ўмовы для далейшага магутнага росту соцыялістычнай вытворчасці.

Гарнякі шахты «Цэнтральнае-ІрмінО» імені Сталіна, радзімы стахановскага руху, выказалі думку ўсіх перадавых рабочых, заклікаўшы ўдзельнікаў спаборніцтва імені Трэцяй сталінскай пяцігодкі перагледзець свае соцыялістычныя абавязацельствы ў сторану іх павышэння і ператварыць дзень стахановскай гадавіны ва ўсенародную праверку выканання сваіх абавязацельстваў. Датэрміновае выкананне народнагаспадарчага плана трэцяй пяцігодкі як па прадукцыйнасці працы, так і па выпуску прадукцыі — вось што павінна стаць і ўжо становіцца зараз цэнтральнай задачай спаборніцтва.

У СССР і пры пераходзе на восем гадзін работы, паранейшаму, самы кароткі рабочы дзень у свеце. Важнейшая задача стахановскага руху ў тым, каб зрабіць самы кароткі рабочы дзень самым прадукцыйным. Выдатная ўласцівасць стахановскай працы — яе роўны рытм. Восьмая гадзіна работы павінна быць па прадукцыйнасці такой-жа поўнацэннай, як і папярэднія сем. Вопыт работы па-новаму паказаў, што ў перадавых рабочых прадукцыйнасць працы прадаўжае расці, і цяпер яны пры васьмігадзіннай рабоце даюць у кожную гадзіну прадукцыі больш, чым пры сямігадзінным рабочым дні. Стахановцы павінны абучыць майстэрству такой работы астатніх рабочых.

Кіраўнікі прадпрыемстваў і ўсе чэсныя рабочыя атрымалі магнейшую зброю для ўмацавання працоўнай дысцыпліны, для абуздання летуноў і прагульшчыкаў, зрываўшых дасягненні стахановцаў і ўдарнікаў. Цяпер цякучасці кадраў пакладзен канец. Трэба разгарнуць барацьбу за максімальнае ўшчыльненне рабочага дня, памятаючы, што спазненне пасля абедзенага перапынку або пакіданне работы да сканчэння рабочага дня роўназначна прагулу. Трэба спалучыць з мерамі прымушэння, якія прымяняе совецкі суд і адміністрацыя прадпрыемстваў, выхаваўчую работу ў масах.

Наша краіна патрабуе ад прамысловасці не толькі больш прадукцыі, але і прадукцыі выдатнай якасці. Цяпер, у сувязі з новым совецкім законам, накіраваным супроць выпуску нядобраякаснай і некамплектнай прадукцыі, барацьба за якасць павінна атрымаць сапраўды большэвіцкі размах.

Усё большае значэнне набывае масавае спаборніцтва рабочых вядучых прафесій. Так, барацьба ўрубмашыністаў за выпрацоўку не менш 10 тысяч тон вугалю на ўрубоўку ў месяц, спаборніцтва металургаў за стахановскія плаўкі і пракат метала багата выдатнымі прыкладамі тэхнічнай ініцыятывы, соцыялістычнай узаімадапамогі, перадачы стахановскага вопыту адстаючым.

Спаборніцтвам і стахановскім рухам трэба кіраваць. Слабасць кіраўніцтва з боку камандзіраў вытворчасці, слабасць прафсаюзнай масава-вытворчай работы выклікалі, як вядома, некаторы перабой у развіцці многастаночнага абслугоўвання. Гэта-ж тармозіць і зараз размах спаборніцтва ў вугальнай прамысловасці і чорнай металургіі. Трэба рашуча знішчыць гэтыя перашкоды і забяспечыць новы ўздым стахановскага руху.

Трэба пакончыць з недаацэнкай ударніцтва: хіба не ясна, што ўдарнікі прадаўжаюць аставацца важнейшым рэзервам стахановскага руху. Рашаючую ролю ў падрыхтоўцы новых рэзерваў стахановскага руху заклікана адыграць стахановская дапамога рабочым, не выконваючым норм. Дабіцца таго, каб на соцыялістычных прадпрыемствах не было ні аднаго рабочага, ні адной работніцы, не выконваючых норм, — вось неабходная прадпасылка для пераходу да калектыўнай стахановскай працы. Значыць, трэба яшчэ шырэй развіць сетку кароткатэрміновых стахановскіх школ, чаго многія гаспадарчыя і профсаюзныя арганізацыі яшчэ не разумеюць. Трэба падняць ролю майстроў, на якіх цяпер ускладзен абавязак усебакова кіраваць сваім вытворчым участкам і ўкараняць стахановскія метады працы.

Стахановскі рух не спыняецца на дасягнутым, ён не застывае ў якой-небудзь адной форме, але бесперапынна развіваецца, удасканальваючы арганізацыю працы і тэхніку вытворчасці. Далейшае яго развіццё пры яшчэ больш актыўным удзеле інжынерна-тэхнічных работнікаў і навукова-даследчых установаў дасць новыя рэзервы для росту прадукцыйнасці працы, для паспяховай барацьбы за эканомію паліва, энергіі, метала, сыравіны.

***

Стахановцы — сталінскія вучні. Большэвіцкая партыя выхоўвае працоўных нашай краіны ў духу новай, свядомай, соцыялістычнай дысцыпліны працы, натхняе іх вялікай ідэяй соцыялістычнага спаборніцтва на працоўныя подвігі, культывіруе ў масах працоўны гераізм. Комуністы і комсамольцы ідуць у першых радах стахановскага руху, паказваючы прыклад комуністычных адносін да працы. На перадавых прадпрыемствах партыйна-тэхнічныя канферэнцыі задаюць тон у развіцці тэхнікі.

Стахановцы паспяхова авалодваюць ведамі, падымаюць свой культурна-тэхнічны ўзровень, папаўняюць рады новай, народнай, соцыялістычнай інтэлігенцыі. Многія стахановцы сталі дзяржаўнымі дзеячамі, выбраннікамі совецкага народа.

Накіроўваемы партыяй Леніна — Сталіна, стахановскі рух вырас, узмацнеў, скрушыў супраціўленне шкоднікаў і іншых ворагаў народа, пераадолеў нямала труднасцей на сваім шляху і ператварыўся ў магутную сілу. Пачотнае імя стахановца служыць у народзе азначэннем перадавога чалавека сталінскай эпохі, любленага совецкага патрыёта.

Ленінградскія рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі ў час вайны ў Фінляндыі паказалі, што значыць працаваць па-стахановску і праявілі цуды гераізма ў тылу, дапамагаючы Чырвонай Арміі граміць ворага. Ленінградцы праектыравалі і выпускалі новыя тыпы баявых машын і іншай абаронная прадукцыі ў небывала кароткія тэрміны. Працаваць так — абавязак кожнага стахановца і ўдарніка, кожнага совецкага чалавека.

Стахановскі рух — гэта самаадданая барацьба мільёнаў перадавых людзей Совецкага Саюза за перамогу комунізма. Пад мудрым кіраўніцтвам вялікага Сталіна ён выканае сваю сусветна-гістарычную задачу.



Многастаночнік гомельскага станкабудаўнічага завода імені Кірава М. Г. Рабсер, абслугоўваючы два такарныя станкі, выконвае норму на 188 проц.

Фото А. Шаевіча. (Фотахроніка БЕЛТА).

ЗА РУБЯЖОМ

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ПАВЕТРАНАЯ ВАЙНА

БЕРЛІН, 28 жніўня. (ТАСС). Як паведамляе Германскае інфармацыйнае бюро, з 1 па 26 жніўня англічане страцілі 1.055 самалётаў.

ЛОНДАН, 28 жніўня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у час налёту непрыяцельскай авіяцыі ў ноч на 27 жніўня забіта і ранена некалькі чалавек у адным з гарадоў Паўднёва-Заходняй Англіі. Разбурэнні нязначныя. Па вестках, у налёце прымала ўдзел 60 самалётаў.

ЛОНДАН, 28 жніўня. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора непрыяцельская авіяцыя праяўляла невялікую актыўнасць. Некалькі невялікіх авіязлучэнняў праціўніка паявілася над узбярэжжам Ла-Манша.

У ноч на 28 жніўня непрыяцельскія самалёты зрабілі налёт на рад раёнаў Англіі, у тым ліку на Лондан. Страты нязначныя, афяр няма. Збіты 4 германскія бамбардыроўшчыкі.

ЛОНДАН, 28 жніўня. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Рэйтэр, 27 жніўня англійскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на аэрадромы Германіі, Галандыі, Бельгіі і акупіраванай часткі Францыі. У ноч на 28 жніўня англійскія самалёты падверглі моцнай бамбардыроўцы вялікі хімічны завод у Лейна, нафтавыя склады і авіяцыйны завод у Франкфурце, завод узрыўчатых рэчываў у Грысгейме, а таксама ваенныя аб'екты ў Кельне і Лейпцыгу. Не вярнуліся на базы два самалёты.

„Дзінст аус Дэйчланд" аб новай фазе наступлення на Англію

БЕРЛІН, 28 жніўня. (ТАСС). Бюлетэнь «Дзінст аус Дэйчланд» піша, што пачынаючы з 24 жніўня германскія аперацыі супроць Англіі ўступілі ў новую фазу. Пачалося планавае разбурэнне ваенных аб'ектаў праціўніка. Паводле паведамлення вярхоўнага камандавання, цяпер у вайне прымаюць удзел толькі другі і трэці паветраныя флоты Германіі. З гэтага відаць, што пакуль прымяняецца толькі невялікая частка авіяцыі.

25 жніўня германскія самалёты ўпершыню падверглі бамбардыроўцы адразу 38 пунктаў, скінуўшы 1.500 бомб агульнай вагой у 150 тон.

Гэта змяненне ў тактыцы баранцьбы выцякае з раней намечанага плана, які пазбаўляе англійскую авіяцыю магчымасці аказаць адпаведнае процідзеянне.

Тактыка германскай авіяцыі

ЛОНДАН, 27 жніўня. (ТАСС). Англійскі друк адзначае, што германскія ваенна-паветраныя сілы змянілі тактыку і перайшлі ад масавых налётаў у дзённы час да начных налётаў асобнымі невялікімі групамі. Друк лічыць, што такое змяненне тактыкі з'яўляецца вынікам цяжкіх страт, панесеных немцамі ў часе апошніх паветраных баёў.

Авіяцыйны аглядальнік газеты «Дэйлі экспрэс» піша, што германскія авіяцыйныя канструктары працуюць зараз над стварэннем браніраваных бамбардыроўшчыкаў, а таксама над канструкцыяй знішчальнікаў, якія валодалі-б больш магутным агнём. Нядаўна збітыя над Англіяй германскія бамбардыроўшчыкі мелі браніраваныя кабіны.

Паводле думкі авіяцыйнага аглядальніка агенцтва Рэйтэр, можна чакаць далейшага ўзмацнення налётаў германскай авіяцыі на Англію, асабліва ў начны час. Як мяркуюць, асноўнай мэтай Германіі ўсё яшчэ астаецца знішчэнне англійскай авіяцыі. Таму дзеянні германскай авіяцыі будуць у асноўным накіраваны супроць аэрадромаў, авіяцыйных прадпрыемстваў і іншых прадпрыемстваў, якія абслугоўваюць авіяцыйную прамысловасць. Такім чынам Германія разлічвае знішчыць англійскае супраціўленне ў паветры. Апрача таго, Германія імкнецца абмежаваць дзеянні англійскай авіяцыі.

Апошнія разведчыя палёты англійскіх самалётаў не выявілі якіх-небудзь адзнак падрыхтоўкі ўтаржэння германскіх войск у Англію. З моманту сканчэння вайны з Францыяй і да першага масіраванага налёту германскіх самалётаў на Англію 8 жніўня прайшло некалькі месяцаў, перш чым Германія здолела перакінуць галоўным чынам у Паўночную Францыю дастатковую колькасць знішчальнікаў і бамбардыроўшчыкаў невялікага радыуса дзеяння. Надзеі Германіі на эфектыўнасць паветранай вайны былі ў значнай меры падарваны супраціўленнем, аказаным англійскай авіяцыяй і зенітнай артылерыяй германскім налётам. Можна чакаць, што па гэтай прычыне Германія ўзмоцніць начныя налёты, бо дзённыя аперацыі аказаліся занадта дорагакаштуючымі. Зараз Германія ўзмоцнена падрыхтоўвае сваіх лётчыкаў для вайны ў начных умовах. Падрыхтоўка лётчыкаў вядзецца галоўным чынам у Цэнтральнай Германіі і ў акупіраванай частцы Польшчы. Зараз Германія імкнецца нанесці сакрушальныя ўдары па некалькіх розных аб'ектах. З гэтай мэтай германскія самалёты па два, а часам і па тры разы ў дзень атакуюць адзін і той-жа аб'ект.

Газета «Ньюс крэнікл» прыводзіць падрабязнасці бамбардыроўкі Рамсгейта. Найбольшыя разбурэнні зроблены ў рабочым раёне горада. Тут многія вуліцы усеяны шклом ад разбітых акон. Разбуран газавы завод.

Як паведамляе карэспандэнт газеты «Дэйлі мейль» з Рамсгейта, афяры ад налёту непрыяцельскай авіяцыі адносна невялікія ў параўнанні з зробленымі ў горадзе разбурэннямі. Гэта аб'ясняецца тым, што ў Рамсгейце ёсць тунель даўжынёй у 3 з палавінай мілі, глыбінёй у 70 футаў. Калі быў падан сігнал паветранай трывогі, тысячы людзей накіраваліся ў тунель, які мае 23 уваходы. У мірны час насельніцтва Рамсгейта складала 34.000 чалавек, зараз яно значна зменшылася. У тунелях-жа могуць размясціцца каля 60.000 чалавек. У часе налёту, меўшага месца 24 жніўня, многа людзей выратавалася толькі дзякуючы наяўнасці гэтага тунеля.

Газета «Ньюс кронікл» паведамляе, што ў выніку бесперапынных налётаў германскай авіяцыі назіраецца бегства насельніцтва з паўночна-ўсходняга ўзбярэжжа.

ЗВОДКА ГЕРМАНСКАГА КАМАНДАВАННЯ

БЕРЛІН, 28 жніўня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі перадае наступную зводку: «З прычыны неспрыяючых метэаралагічных умоў германская авіяцыя абмежавалася ўчора разведчымі дзеяннямі.

У ноч на 28 жніўня буйныя злучэнні самалётаў зрабілі налёт на порты, верфі, авіяцыйныя і ваенныя заводы Англіі і Шатландыі. У Саутгемптоне, Эбердзіне, Дэнды, Ліксе і Гуле бамбардыраваны галоўным чынам авіяцыйныя заводы.

Ноччу англійскія самалёты скінулі бомбы на тэрыторыі Германіі, не прычыніўшы прыкметных страт. У Кіле пашкоджана некалькі жылых дамоў. Збіты тры англійскія самалёты. Падводная лодка затапіла некалькі непрыяцельскіх суднаў тэнажам у 28.600 тон, ішоўшых пад моцным канвоем. З французскага ўзбярэжжа Ла-Манша германская артылерыя страляла па двух непрыяцельскіх падводных лодках, якія, відаць, патанулі. У Індыйскім акіяне германскія ваенна-марскія сілы затапілі ўзброены англійскі танкер «Брытыш камандэр» тэнажам у 6.901 тону».

БАМБАРДЫРОЎКА ЛОНДАНА

ЛОНДАН, 27 жніўня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, германскія самалёты ў ноч на 27 жніўня знаходзіліся над Лонданам на працягу 6 гадзін. Паветраная трывога, аб'яўленая ў гэтую ноч у Лондане, па сваёй працягласці перавышае ўсе паветраныя трывогі, якія аб'яўляліся ў Лондане з пачатку вайны. На працягу ўсёй ночы неба над Лонданам асвятлялася праменнямі пражэктараў і ўспышкамі выстралаў зенітных гармат, якія не спынялі стральбы. Паводле заявы відавочнікаў, германскія самалёты наближаліся да горада ў адзіночку або невялікімі атрадамі. Зрабіўшы круг над горадам, самалёты скрываліся ў цемру, а следам за імі паяўляліся новыя атрады.

Як паведамляюць, у раёне Лондана была скінута значная колькасць бомб. Па думцы многіх кругоў, гэты налёт быў прадпрынят галоўным чынам з тым, каб выклікаць у горадзе паніку.

У камюніке міністэрства авіяцыі гаворыцца, што, паводле апошніх вестак, у часе ўчарашніх налётаў на Англію было збіта 46 германскіх самалётаў.

Інцыдэнты на румына-венгерскай граніцы

НЬЮ-ЙОРК, 27 жніўня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Юнайтэд Прэс з Будапешта, у венгерскіх кругах заяўляюць, што румынскія войскі адкрылі агонь па венгерскіх пагранічніках ля пункта Лайостанья, на ўсход ад Сегеда.

РЫМ, 27 жніўня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Стэфані, у Будапешце апублікавана камюніке аб тым, што сёння каля 11 гадзін раніцы, ля Дэбрэцэна (Венгрыя) адзін румынскі самалёт нанёс пашкоджанне і прымусіў да пасадкі венгерскі бамбардыроўшчык, які рабіў вучэбны палёт. Венгерскі лётчык пяжка ранен. Пасля сутычкі румынскі самалёт скрыўся ва ўсходнім напрамку.

БІБЛІЯГРАФІЯ

Зборнік вершаў А. Куляшова на рускай мове

Выдавецтва «Художественная литература» выдала на рускай мове невялікі зборнік вершаў Аркадзія Куляшова «Дубрава» *). У зборнік увайшлі вершы, напісаныя ў апошнія годы, і невялікая паэма «В зеленой дубраве».

Аркадзь Куляшоў — паэт-лірык, займаючы ў беларускай літаратуры асобае месца. Яго манера пісання, прыёмы раскрыцця ўнутранага свету вобраза адрозніваюць паэта ад многіх сутаварышоў па пяру. У сваёй лірыцы А. Куляшоў, выражаючы асабістыя пачуцці, не абмяжоўвае іх уласным «я», а імкнецца дасягнуць значных сопыяльных і мастацкіх абагульненняў. Праз асабістае пачуццё паэт паказвае грамадскія з'явы, і ў сваю чаргу жыццё нашай краіны знаходзіць сваё адлюстраванне ў лірычных вершах Куляшова. Акружаючая рэчаіснасць, уздзейнічаючы на паэта, знаходзіць сваё выражэнне ў яго чыстым, сардэчным, паэтычным голасе.

А. Куляшову ўласціва асаблівая паэтычная добрасумленнасць. Ён імкнецца рознымі прыёмамі—і формай, і здзіўляючай прастатой мовы, і нечаканай канцоўкай дасягнуць найбольшага эфекта.

Вось характэрныя ўрыўкі з верша «Утро», які ўвайшоў у зборнік.

Иду я на рассвете
В разведку — завтра бой.
Ты, утро, как свидетель,
Иди вослед за мной...

О утро, друг мой лучший,
Не дай врагам пройти,
Кидай под ноги сучья,
Запутай все пути...

Состорь, дубок —
Для птичек
Дупло пусть бухет тут,
Пусть голубых яичек
Певуньи нанесут.

И не попасть в долину,
В мой край ни вплавь, ни вскачь.
...А я?
А я загину.
А ты?
А ты не плач.

Першыя два радкі апошняй страфы ў перакладзе гучаць некалькі горш, чым у арыгінале, але ў цэлым верш захоўвае непасрэдную прастату, пейкую асаблівую празрыстасць і абаяльнасць.

Часта А. Куляшову ўдаецца дасягнуць выключнага паэтычнага эфекта. Так, напрыклад, яго «Облачко» — сведчанне ўдалых паэтычных шуканняў.

Вдруг леску дернуло разок, —
Добыча подплывает!
С пером гусиным поплавок
Под облачко ныряет.

У вершы «Улица Московская», напісаным вельмі цёпла, прасякнутым мяккім, ледзь прыкметным юмарам, пасля раду ўдалых па вобразнасці строф, паэт робіць вывад, што дзе-б ён ні быў, ён адчувае сябе ў непасрэднай блізасці ад сэрца нашай радзімы — цудоўнай Масквы.

Нельга не хваляваца, чытаючы верш «Отец». Паэт гаворыць, што калі зайграюць трубы вайны, ён разам з сваім палком пойдзе ў крывавы бой з ворагам, не дапускаючы,

Чтоб в копоти огня порохового,
Под взвг свинца не обожгла война
Моей отчизны полдня золотого,
Моей дочурки утреннего сна.

А калі далёка на чужой зямлі яму давядзецца сустрэць «мертвый час», — ён пашле сваёй маленькай дочцы наказ: калі яна падрасце — горача любіць таго, хто з'яўляецца іх агульным бацькам, бацькам «семьи несчетной».

Увесь верш прасякнут глыбокім пачуццём чалавека, бацькі і грамадзяніна — патрыёта сваёй радзімы. А побач з пяшчотным бацькоўскім пачуццём любві да маленькай дачкі, адчуваецца сыноўная любоў радавога чалавека нашай краіны да правадыра большэвіцкай партыі, у імя якога ён гатоў ісці на подвіг славы, не баючыся ні магчымых пакут, ні смерці.

Верш «Отец» — адзін з лепшых вершаў зборніка.

Праўда, не ўсе прадстаўленыя ў «Дубраве» вершы напісаны на адпаўлкавым узроўні. Ёсць лепшыя і горшыя. Але і тыя з вершаў, якія можна прылічыць да разраду «горшых», — зусім не дрэнныя творы. У кожным з іх ёсць многа цікавага для чытача і пахвальнага для аўтара.

Змешчаную ў зборніку паэму «В зеленой дубраве» наўрад ці можна лічыць паэмай у сапраўдным сэнсе гэтага слова. Хутчэй гэта ўмоўная назва вялікага верша. У гэтым творы няма закончанай абрысоўкі падзей. Аўтар дае больш ці менш удалыя эскізы карцінак з жыцця калгаснай моладзі. Але і іх, гэтых эскізных накідаў, нямнога, і чытач вымушан абмяжоўвацца тым, што яму ўдаецца ледзь запамятаць слабыя контуры вобразаў Хрысцінкі, Васіля і Івана. Аднак і тут трэба аддаць належнае А. Куляшову і перакладчыку Н. Сідарэнка. Верш чытаецца лёгка, ёсць удалыя месцы, хоць, як мы ўжо сказалі вышэй, паэму ў цэлым нельга лічыць удачай аўтара.

Выданне зборніка вершаў А. Куляшова на рускай мове дае магчымасць чытачу Совецкага Саюза хоць-бы ў некаторай ступені азнаёміцца з творчасцю аднаго з таленавіцейшых прадстаўнікоў паэтычнай моладзі Совецкай Беларусі.

Г. ТАРАН.

*) Аркадзь Куляшоў, «Дубрава». Дзяржаўнае выдавецтва «Художественная литература», Масква. 1940 г. Тыраж 5.000 экз. Стар. 61. Цана 2 руб.

Стаханаўка-паліроўшчыца віцебскай ф... гнутай мэбл В. Н. Дзюбіна, уключы... ў социялістычнае спаборніцтва ў част... тай гадавіны стахановскага руху, вы... норму на 230 проц.
Фото І. Лосева. (Фотахроніка БЕЛТ...

НОВЫ ЦЭХ

У Барысаве на заводзе «Чырвоны ліст» пачата пабудова новага цэха м... пакрыццяў. У гэтым цэху будзе п... дзіцца пакрыццё нітрафарбамі розны... талапрадметаў шырокага спажывання... арганізуецца таксама вытворчасць ... чых цацак — вядзёркаў, савочкаў, ... ляў і інш. — на суму да 200 ... рублёў у год. Цэх павінен быць пу... у эксплаатацыю ў канцы года.

Многадзетныя мацеры атрымліваюць дапамогу

Закон аб дапамозе многадзетным— з выдатнейшых сведчанняў вялікіх ... лінскіх клопатаў аб чалавеку, аб ма... аб совецкіх дзецях.

За 1939 год многадзетным ма... пражываючым у Мінскай вобласці, выплачана 8.906 тыс. рублёў дап... Толькі за 6 месяцаў бягучага года ... плачана 5.271 тысяча рублёў.

Вячэрні прыём у аддзяленнях міліцыі

Раней у аддзяленнях міліцыі прым... праводзілася толькі да 1 гадзіны ... Зараз для лепшага абслугоўвання на... ніцтва па прыпісцы і абмену пашпа... у аддзяленнях міліцыі Мінска арганіз... вячэрні прыём.

Прыём праводзіцца штодзённа з 2(... 22 гадзін, апрача суботы і нядзелі.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

29 жніўня, у 7 г. 30 м. вечара, ... Доме настаўніка (Комуністычная, ... адбудзецца нарада сакратароў пярвіч... партарганізацый, сакратароў пярвіч... комсамольскіх арганізацый і дырэктар... прадпрыемстваў Варашылаўскага раёна.

Яўка абавязкова.

Сакратар КП(б)Б. Варашылаўскага райк... РУТМАН.

Вадаправод на акраінах Мінска

У Мінску па Старавіленскаму тракту, у раёне за Пасажырскім вакзалам і на іншых акраінных вуліцах устаноўлена 11 новых водаразборных калонак. Жыхары гэтых вуліц атрымліваюць зараз здаровую і чыстую піцьцевую ваду. Да канца года будзе пабудавана яшчэ 22 калонкі. У раёне Козырава пушчана ў эксплаатацыю новая артэзіянская скважына. Заканчваецца будаўніцтвам артэзіянскі калодзеж па Новаўфімскай вуліцы.

На Беларускай вуліцы пракладзена 1.000 метраў гарадской вадаправоднай магістралі. У пачатку верасня будзе ўкладзена вадаправодная сетка даўжынёй у адзін кілометр па Брылеўскаму завулку. Трубы ўжо завезены. У вадаправодную сетку ў бліжэйшыя дні ўключаюцца Красная і Радашкоўская вуліцы.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ

ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА РУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА БССР.
(Памяшканне Дзярж. яўрэйск. тэатра БССР)
29 жніўня
«ОПАСНЫЙ ПОВОРОТ»
Пачатак у 8 г. 30 м. вечара.
Каса адкрыта з 2 г. дня да 9 г. вечара.
Гарадскія касы з 12 г. дня да 6 г. вечара.

ГАСТРОЛІ ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРА МУЗЫКАЛЬНАЙ КАМЕДЫІ БССР.
(Памяшканне Белдзяржрдрам-тэатра)
29 жніўня
«СИЛЬВА»
Пачатак у 8 г. 30 м. вечара. Білеты ў касе тэатра з 2 да 8 г. 30 м. вечара і ў гарадскіх касах з 12 г. дня да 6 г. вечара.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЗНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

З 23 жніўня
АДКРЫТ ПАПЯРЭДНІ ПРОДАЖ БІЛЕТАЎ НА СЯМІДЗЁНКУ
1 і 3 ВЕРАСНЯ
КВЕТКА ШЧАСЦЯ
Опера ў 3 дзеях, з пралогам. Музыка А. ТУРАНКОВА.
КАСЫ ТЭАТРА ПРАЦУЮЦЬ з 12 да 6 г. вечара ў НАСТУПНЫХ МЯСЦАХ: пл. СВАБОДЫ (б. Дом саюзаў), ДОМ УРАДА (правае крыло, газетны кіёск), МАГАЗІН САНГІГІЕНЫ (рог вул. Ленінскай і Совецкай), ГАСЦІНІЦА «БЕЛАРУСЬ», ГАСЦІНІЦА «ЕЎРОПА» і памяшканне ТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА (пл. Парыжскай Камуны). ДАВЕДКІ па тэл. 21-420

КАМІТЭТУ ПА СПРАВАХ МЕР І ВЫМЯРАЛЬНЫХ ПРЫБОРАЎ ПРЫ СНК БССР (Правадная, 6)
ПАТРАБУЕЦЦА
БУХГАЛТАР.
АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.
Звяртацца да галоўнага бухгалтара.

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР
ПАВЕДАМЛЯЕ, што
8 ВЕРАСНЯ, У 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА, У ПАМЯШКАННІ ЗАЛА ЛАБАРАТОРНАГА КОРПУСА АН БССР (вул. Пушкіна, 58)
адбудзецца
ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА СОВЕТА ІНСТЫТУТАЎ ХІМІІ І ТОРФУ АН БССР,
НА ЯКІМ АДБУДЗЕЦЦА
АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫЙ
НА АТРЫМАННЕ ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ КАНДЫДАТА ХІМІЧНЫХ НАВУК:
1. Г. В. ЛІПАТАВАЙ на тэму: «ДА ПЫТАННЯ АБ ПРЫРОДЗЕ РАСТВОРАЎ НІТРАЦЭЛЮЛОЗЫ;
афіцыяльныя апаненты — член-карэспандэнт Акадэміі навук СССР П. А. РЭБІНДЭР і член карэспандэнт Акадэміі навук БССР Б. В. ЕРАФЕЕЎ;
2. Д. З. ГІНЗБУРГ на тэму: «АДСОРБЦЫЯ АРГАНІЧНЫХ КІСЛОТ НА ВУГАЛІ СА ЗМЕШАНЫХ РАСТВАРЫЦЕЛЯЎ»;
афіцыяльныя апаненты — акадэмік С. М. ЛІПАТАЎ і член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР Б. В. ЕРАФЕЕЎ.
З ДЫСЕРТАЦЫЯМІ МОЖНА АЗНАЁМІЦЦА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ АКАДЭМІІ НАВУК БССР — вул. ПУШКІНА, 56.

ДЗЯРЖЦЫРК (ПАРК імені ГОРКАГА, тэл. 22-725).
ВЯЛІКАЯ ЦЫРКАВАЯ ПРАГРАМА ў 3-х аддзяленнях.
СЁННЯ
выдатнае спартыўнае прадстаўленне
КОНКУРС АТЛЕТЫЧНАГА ЦЕЛАСЛАЖЭННЯ
Удзельнічаюць усе барцы.
БОРУЦЦА 25 ПАР.
Розныя ігры, індзейскі бокс і многа інш.
Працяг матчаў французскай баранцьбы.
Боруцца 3 пары:
1. ПАДДУБНЫ—БУРЭВОЙ.
2. ДЗЯКОЎСКІ—САЛАЎЕЎ.
3. Баранцьба рэванш СТРЫЖАК—ЛЕБЕДЗЕЎ.
Пачатак у 9 г. веч. Пачатак баранцьбы ў 11 г. веч.

Кінотэатр «Чырвоная зорка» ЦАНА ЖЫЦЦЯ
Кінотэатр «Родина» НА ДАЛЬНЯЙ ЗАСТАВЕ
Кінотэатр «Інтэрнацыянал» «ЗАКЛЮЧЕННЫЕ»
Кінотэатр «Спартак» ТРАКТАРЫСТЫ
Дзіцячы кінотэатр «ДАРИКО»
Кінотэатр «Навіны дня» 1. VII Сесія Вярхоўнага Совета СССР. (Выпуск II). 2. СТАЛІНСКАЕ ПЛЕМЯ (фізкультурны парад у Мінску) 3. САЮЗКІНОЖУРНАЛ № 70.

Кінотэатр „РОДИНА"
З 29 жніўня
НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
НА ДАЛЬНЯЙ ЗАСТАВЕ
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ:
засл. арт. Таджыкскай ССР А. БУРХАНАЎ, засл. арт. рэсп. В. БЛЮМЕНТАЛЬ-ТАМАРЫН, арт. А. БАРАНАЎ.
Тэкст песень паэтаў-ордэнаносцаў В. ЛЕБЕДЗЕВА-КУМАЧА і Г. ЛАХУЦІ.
НА ЛЕТНЯЙ ЭСТРАДЗЕ
КАНЦЭРТНАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ.
ПАЧАТАК СЕАНСАЎ у 6, 7.40, 9.20 і 11 г. вечара.
Каса адкрыта з 1 гадзіны дня.

УСЕСАЮЗНАЯ КАНТОРА „ЦЕНТРОУТИЛЬ" Центрасаюза СССР і РСФСР
ЗБІРАЙЦЕ І ПРАДАВАЙЦЕ ЛОМ ЧОРНЫХ МЕТАЛАЎ
СЕЛЬПО І ЗАГАТОЎЧЫМ КАНТОРАМ РАЙСПАЖЫЎСАЮЗАЎ!
У КОЖНЫМ СОЎГАСЕ, МТМ, МТС, НА КАЛГАСНЫМ ДВАРЭ, У ХЛЯВАХ, КУЗНЯХ І МАЙСТЭРНЯХ ЛЯЖАЦЬ НЕПАТРЭБНЫЯ, ПАЛАМАНЫЯ І НЕПАДДАЮЧЫЯСЯ АДНАЎЛЕННЮ:
ВІЛКІ, РЫДЛЁЎКІ, КАЦЯЛКІ, ВІЛЫ, СЯКЕРЫ
ГРАБЛІ, КОСЫ, СЯРПЫ, ПАДКОВЫ, ЛЕМЕХІ
БАРОНЫ, ЧАСТКІ ТРАКТАРАЎ, СЕЯЛАК
І ІНШЫХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ МАШЫН.
МЕТАЛІЧНЫ ЛОМ ПАТРЭБЕН ЗАВОДАМ ЧОРНАЙ МЕТАЛУРГІІ.
Ачышчайце свае двары і майстэрні ад лому
ЗБІРАЙЦЕ І ПРАДАВАЙЦЕ ЯГО СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЕРАЦЫІ.
Арганізуйце вывазку металічнага лому да пагрузачных пунктаў чыгунак на сваім аўтагужавым транспарце.
Час дастаўкі лому к пагрузачным пунктам узгадніце з сельпо або з заготканторай райспажыўсаюза.
За аданы металічны лом сельпо і заготканторы райспажыўсаюзаў уплачваюць па зацверджаных цэнах:
за тону чыгуна 60 руб.
за тону жалезна-стальнога лому 45 руб.
за тону дахавага жалеза і стружкі 10 руб.
ПЕРАВОЗКА АПЛАЧВАЕЦЦА АСОБНА ПА СТАЎКАХ, ЗАЦВЕРДЖАНЫХ МЯСЦОВЫМ ВЫКАНКОМАМ.

На падставе рашэння ўрадавых органаў і загада народнага камісара комунальнай гаспадаркі БССР,
ТРЭСТЫ БЕЛЖЫЛСНАБ І БЕЛСНАБ РЭАРГАНІЗАВАНЫ
У АДЗІН СНАБЖЭНЧА-ЗБЫТАВЫ ОРГАН
„ГАЛОЎЖЫЛКОМУНСНАБ"
НАРКАМАТА КОМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР
з абласнымі базамі ў гарадах: ВІЦЕБСКУ, ГОМЕЛІ, МАГІЛЕВЕ, БЕЛАСТОКУ І ПІНСКУ
І ЦЭНТРАЛЬНАЙ БАЗАЙ У ГОРАДЗЕ МІНСКУ.
ФУНКЦЫІ БЫЎШЫХ ТРЭСТАЎ БЕЛЖЫЛСНАБА І БЕЛСНАБА ПОЎНАСЦЮ ПЕРАШЛІ Ў «ГАЛОЎЖЫЛКОМУНСНАБ».
ДЛЯ ЛЕПШАГА АБСЛУГОЎВАННЯ ДОМАЎПРАЎЛЕННЯЎ У ГАРАДАХ «ГАЛОЎЖЫЛКОМУНСНАБАМ» АРГАНІЗУЮЦЦА СКЛАДЫ — МАГАЗІНЫ БУДАЎНІЧЫХ І САНТЭХНІЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ.
ГАЛОЎЖЫЛКОМУНСНАБ.

БЕЛСЕЛЬГАСХІМСНАБУ
ПАТРАБУЮЦЦА
ГАЛОЎНЫЯ БУХГАЛТАРЫ
для работы ў аблканторах заходніх і ўсходніх абласцей БССР.
Звяртацца: Мінск, Совецкая, 50, тэл. 23-835.

УПРАЎЛЕННЕ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР
РЭСПУБЛІКАНСКІ ТУР
УСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСА НА ЛЕПШУЮ П'ЕСУ
ПРАЦЯГНУТ ДА 1 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.
П'есы накіроўваць па адрасу: Мінск, Дом урада, Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР, Оргкамітэту конкурса.
ОРГКАМІТЭТ КОНКУРСА НА ЛЕПШУЮ П'ЕСУ ПА БССР.

Калектыў навуковых і адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў і студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта выражаюць сваё спачуванне родным з нагоды пасцігнага іх гора смерці Надзежды Афанасьеўны ПРАКАПЧУК — дацэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта.
РЭКТАРЫЯТ І МЯСЦКОМ БДУ

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Совецкая 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 20-000 (камутатар) дадатковы — 102, прыёмная рэдактара — 2-13-52, намесніка адказнага рэдактара — 2-51-88, адказнага сакратара — 2-18-53, намесніка адказнага сакратара — 2-24-12, сакратарыята — 2-39-55. АДДЗЕЛАЎ: заг партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56, заг. аддзелам прапаганды і агітацыі — 2-51-89, заг. эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56, літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах і ваенна-фізкультурнай работы 2-18-85, унутранай інфармацыі — 2-13-99, аддзела рабселькораў і пісем працоўных — 2-08-44, 2-18-45, заг. выдавецтва — 2-13-58, бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 2-13-60, выпускаючага — 2-47-68, карэктуры — 2-13-57.

У3356

Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49.

Кр., М., Ш.